№ 46 (548) 13 сьнежня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Царэвіч Дзімітрый



Уладзімір Пуцін выбраў сабе ў пераемнікі лібэрала. **Старонка 3.**

### У НУМАРЫ

**Эўрасаюз зьніжае планку патрабаваньняў да Лукашэнкі**

Хаўер Саляна: «Мы не чакаем, што беларускія ўлады адразу выканаюць усе 12 умоваў ЭЗ». **Старонка 4.**

**Элемэнтарна, Вова!**

Закід інфармацыі пра Канстытуцыйны акт выгадны Лукашэнку, каб атрымаць камфортныя стартавыя пазыцыі на перамовах з Пуціным. Піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 6.**

**МВФ прагназуе эканамічны крызіс у нашым рэгіёне**

Міжнародны валютны фонд папярэдзіў пра гэта краіны Балтыі і Ўкраіну. **Старонка 8.**

## У змаганьні Вячоркі зь Міхалевічам перамог Баршчэўскі



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лявону Баршчэўскаму (у цэнтры) няпроста далося рашэньне вярнуцца ў палітыку. На фота: у перапынку паседжаньня зьезду Партыі БНФ. Старонка 12.**

## У Салігорску, Слуцку, Горадні, Берасьці, Бярозе, Карэлічах, Віцебску і Пецярбургу

Сустрэчы з рэдактарамі і аўтарамі «НН» і ARCHE.

**13 сьнежня** рэдактар ARCHE Валер Булгакаў, аўтар «НН» Зьміцер Панкавец прыедуць у **Слуцак** і **Салігорск**. Удзел у сустрэчах возьмуць былы партызан, пісьменьнік Валянцін Тарас, які прэзэнтуе кнігу сваіх мэмуараў «На высьпе ўспамінаў», і Наталка Бабіна, якая прадставіць новы раман «Рыбін горад».

Сустрэча ў Слуцку пачнецца а 18-й. Даведкі: (029) 690–34–74 (Віталь). У Салігорску — а 20-й. Даведкі: (029) 615-10-46 (Павал).

Увага! Сустрэча ў Берасьці пераносіцца. Булгакаў, Валянцін Тарас і Наталка Бабіна наведаюць **Берасьце 21 сьнежня**. Сустрэча адбудзецца ў 19.00 у рэдакцыі газэты «Брестский курьер». Даведкі: (029) 660-57-41, (029) 724-21-16 (Зьміцер).

**22 сьнежня** ўвечары яны сустрэнуцца з чытачамі ў **Бярозе**.

На канец сьнежня — студзень маем у задумах сустрэчы з чытачамі ў **Пецярбургу** (там адбудзецца цырымонія прысуджэньня прэміі ARCHE за 2007 год), у **Карэлічах** і **Віцебску**. Дакладны час гэтых спатканьняў яшчэ ня вызначаны.

Запрашайце нас, і мы прыедзем, нават у самую малую вёсачку, дзеля сур'ёзнага абмену думкамі і прэзэнтацыі апошніх выданьняў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Акцыя ў абарону незалежнасьці Беларусі 12 сьнежня скончылася драматычным здарэньнем. У сутычцы з амонам моцна пацярпеў Зьміцер Хведарук. Непрытомным яго адвезьлі ў 9-ты клінічны шпіталь. Старонка 5.**

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

## Расея Мядзьведзева будзе ўсё далейшая ад Лукашэнкі

Выбар Пуціна стаў вядомы. Мядзьведзеў — прафэсарскі сын, гадаванец Пецярбургу, народжаны ў 1965 годзе, сталеньне якога прыпала на гады вайны ў Аўганістане і гнieньня савецкай імпэрыі. У расейскай вярхоўцы цяжка знайсьці некага больш эўрапейскага ў сілу свайго паходжаньня. Нездарма Пуцін столькі сілаў уклаў у сваю піяр-кампанію перад выбарамі: без падтрымкі Пуціна Мядзьведзеву цяжка было б перамагчы.

Мядзьведзеў мае выдатныя сувязі, калі не сказаць — повязі — з расейскім капіталам. «Газпром» стаіць за ягонай кандыдатурай. Ён безумоўна працягне разьвіцьцё дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму, а курс на пабудову энэргетычнай імпэрыі застанецца нязьменны. Гэта азначае, што захаваньне высокіх цэнаў на энэрганосьбіты будзе і надалей галоўнай задачай замежнай палітыкі Расеі. Гэта азначае таксама, што інтарэсы Расеі будуць і надалей дыямэтральна супрацьлеглымі інтарэсам малых усходнеэўрапейскіх дзяржаваў, у тым ліку Беларусі.

Гэта дазваляе з стопрацэнтавай імавернасьцю спрагназаваць, што за чатыры гады Беларусь будзе яшчэ далейшая ад Расеі, і паявлячвае гіпатэтычныя шанцы на збліжэньне Беларусі з Эўрасаюзам.

Мядзьведзеў азначае таксама карэкцыю курсу на пабудову ў Расеі дзяржавы лібэральна-капіталістычнага ўзору. Такая Расея будзе нашмат больш прыцягальнаю, чым Расея абсалютысцкая ці аўтарытарная. Культурная прывабнасьць Расеі будзе расьці, і ад таго будуць паўставаць новыя культурныя выклікі перад Беларусьсю.

# Пуцін выбраў лібэрала

Чатыры партыі — «Адзіная Расея», «Справядлівая Расея», «Аграрная партыя» і «Грамадзянская сіла» — вылучаюць у якасьці адзінага кандыдата ў прэзыдэнты РФ Дзьмітрыя Мядзьведзева. Пуцін падтрымаў гэтую кандыдатуру. Новым прэзыдэнтам Расеі стане лібэрал, чалавек эўрапейскага выхаваньня і абаронца інтарэсаў «Газпрому».

Прэзыдэнт Расеі заявіў, што цалкам падтрымлівае гэтую кандыдатуру. Уладзімер Пуцін сказаў, што «ведае Дзьмітрыя Мядзьведзева і цесна і плённа працаваў зь ім больш чым сямнаццаць год».

Пуцін сказаў, што лічыць рэальным гарантаваньне пераемнасьці ўлады ў Расеі з улікам таго, што чатыры партыі вылучылі адзінага кандыдата ў прэзыдэнты, прычым дзьве з гэтых партыяў зьяўляюцца парлямэнцкімі і маюць у Думе ўстойлівую большасьць.

Прэзыдэнт Расеі адзначыў, што прапанова, якая паступіла ад чатырох партыяў, «дае нам шанец сфармаваць умовы для правядзеньня курсу, які б прыносіў вынікі ўсе апошнія гады».

Са свайго боку Дзьмітрый Мядзьведзеў паведаміў, што кансультацыі, якія тычацца ягонай кандыдатуры, будуць працягнутыя ў найбліжэйшыя два дні.

**АГ**



**Дзьмітры Мядзьведзеў**

нарадзіўся ў 1965 г. у Ленінградзе. Бацька быў прафэсарам Ленінградзкага тэхналягічнага інстытуту (памёр у 2004 г.), маці — філёляг, выкладала ў Пэдагагічным інстытуце імя Герцана, пазьней працавала экскурсаводам у музэі.

Дзьмітры Мядзьведзеў быў адзіным дзіцём у сям'і, якая жыла ў рабочым раёне Купчына на ўскраіне Ленінграду.

Скончыў юрыдычны факультэт (катэдра грамадзянскага права) Ленінградзкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (1987 г.), і асьпірантуру ЛДУ (1990 г.).

У студэнцкія гады захапляўся фатаграфіяй і рок-музыкай (любіў «Black Sabbath» і Озі Озбарна), займаўся цяжкай атлетыкай, выйграў у сваёй вагавай катэгорыі спаборніцтвы ва ўнівэрсытэце.

Ажаніўся ў 1989 г. са Сьвятланай Ліньнік, зь якой вучыўся ў адной школе. Жонка скончыла фінансава-эканамічны інстытут, жыве ў Маскве, займаецца арганізацыяй грамадзкіх мерапрыемстваў у Санкт-Пецярбургу.

Сын Ільля — 1996 году нараджэньня.

Дзьмітры Мядзьведзеў — кандыдат юрыдычных навук, дацэнт. З 1990 да 1999 году выкладаў у Санкт-Пецярбурскім дзяржаўным унівэрсытэце, адначасова ў 1990—1995 гадах быў дарадцам старшыні Ленінградзкага гарадзкога савету Анатоля Сабчака.

У 1993 г. выступіў адным з заснавальнікаў фірмы «Фінцэл», якая неўзабаве заснавала ЗАТ «Ілім Палп Энтэрпрайз», адзін з гігантаў расейскага лесапрамысловага бізнэсу. У новай фірме Мядзьведзеў стаў дырэктарам у юрыдычных пытаньнях.

У 1999 г. — намесьнік кіраўніка апарату ўраду Расейскай Фэдэрацыі Дзьмітрыя Козака.

У 1999—2000 г. — намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта РФ. У 2000—2003 г. — першы намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта РФ.

У 2000—2002 — старшыня Рады дырэктароў ААТ «Газпром». З кастрычніка 2003 г. да лістапада 2005 г. — кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта РФ.

14 лістапада 2005 г. прызначаны першым намесьнікам старшыні ўраду Расейскай Фэдэрацыі.

## Будучы прэзыдэнт Мядзьведзеў папрасіў Пуціна стаць прэм'ерам

Кансультацыі першага віцэ-прэм'ера Дзьмітрыя Мядзьведзева зь лідэрамі партый, што прапанавалі ягоную кандыдатуру на пост прэзыдэнта Расеі, скончыліся тым, што кандыдат у кандыдаты выступіў з сустрэчнай прапановай: Пуцін пасьля абраньня новага прэзыдэнта павінен узначаліць урад Расеі.

Сам Пуцін яшчэ 1 кастрычніка на зьезьдзе «Адзінай Расеі» назваў дзьве ўмовы, пры якіх можа ўзначаліць урад Расеі: «Адзіная Расея» павінна перамагчы на думскіх выбарах 2 сьнежня, а прэзыдэнтам краіны павінен стаць «дзеяздольны, сучасны чалавек».

**КАМЭНТАР**

## Лукашэнкаўцам мову адняло

Увечары ў панядзелак дзяржаўнае агенцтва БЕЛТА ўсё яшчэ ніяк не адрэагавала на абвяшчэньне Мядзьведзева кандыдатам у наступнікі Пуціна. Галоўнай навіной на сайце працягвала стаяць інфармацыя пра перамогу беларускага гаўрыка на «Эўрабачаньні», галоўным камэнтаром — развагі на тэму канфэрэнцыі па праблемах зьмены клімату на Балі.

Прыход да ўлады абаронцы інтарэсаў прыватнага капіталу і энэргетычных манаполіяў — ня той выбар, які мог спадабацца

**Працяг на старонцы 7.**

# Эўрасаюз зьніжае планку патрабаваньняў да Лукашэнкі

Хаўер Саляна: «Мы не чакаем, што беларускія ўлады адразу выканаюць усе 12 умоваў ЭС».

«Мы рэалісты і, натуральна, не чакаем, што беларускія ўлады выканаюць усе 12 умоваў ЭС адразу», — заявіў у інтэрвію БелаПАН вярхоўны прадстаўнік Эўрапейскага саюзу па супольнай замежнай палітыцы і бясьпецы Хаўер Саляна.

Ён нагадаў, што ў выдадзеным у 2006 годзе дакумэнце «Што Эўрапейскі саюз можа даць Беларусі» выкладзеныя ўсе выгады паўнавартаснага ўдзелу краіны ў Эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва і 12 умоваў, якія неабходна для гэтага выканаць.

«Відавочна, што ўсё ня можа зьмяніцца за адну ноч, — зазначыў Х.Саляна. — Аднак нам неабходна ўбачыць пачатак канкрэтнага і пераканаўчага працэсу дэмакратызацыі, які паступова прывядзе да выкананьня ўсіх 12 пунктаў, згаданых у дакумэнце». Пры гэтым Х.Саляна падкрэсьліў, што ёсьць «пэўныя мінімальныя ўмовы», выконваць якія неабходна ў першую чаргу. «Самая важная сярод іх — вызваленьне палітзьняволеных і спыненьне арыштаў і перасьледу прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці і апазыцыі», — сказаў вярхоўны прадстаўнік ЭС.

Х.Саляна таксама зазначыў, што парлямэнцкія выбары ў 2008 годзе даюць Беларусі выдатную магчымасьць прадэманстраваць станоўчыя зьмены. «Сярод магчымых крокаў у гэтым напрамку я б хацеў назваць уключэньне прадстаўнікоў апазыцыі ў выбарчыя камісіі і рэгістрацыю апазыцыйных кандыдатаў для ўдзелу ў выбарах», — сказаў Х.Саляна. Ён падкрэсьліў, што канкрэтныя захады з боку Беларусі дазволілі б пачаць «будаўніцтва рэальнага партнэрства». «Пры гэтым павінна быць відавочна, што гэтыя крокі будуць спрыяць паляпшэньню сытуацыі, а не яе пагаршэньню», — падкрэсьліў прадстаўнік ЭС.

Паводле яго слоў, Эўрасаюз занепакоены пытаньнем пра свабоду сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі. «Мы раней ужо ня раз казалі пра неабходнасьць свабоднага распаўсюду незалежных недзяржаўных выданьняў», — нагадаў Х.Саляна. Ён заявіў, што ЭС мае намер «уважліва сачыць» за судовым разборам паводле пазову Мікалая Чаргінца да газэты «Новы час» і журналіста Аляксандра Тамковіча. «Вельмі важна, каб судзьдзі не выкарыстоўваліся для таго, каб прымусіць газэты замаўчаць», — падкрэсьліў Х.Саляна.

Эўрасаюз гатовы пачаць перамовы па спрашчэньні візавага рэжыму і пагадненьні пра рэадмісію, як толькі краіна стане паўнавартасным удзельнікам Эўрапейскай палітыкі добрага суседзтва (ЭПД).

Паводле ягоных словаў, толькі ў гэтым выпадку магчыма зьніжэньне цэнаў на шэнгенскія візы для грамадзянаў Беларусі. Для грамадзянаў Украіны, Малдовы і Расеі цана на візы складае 35 эўра, бо з гэтымі краінамі заключаныя адпаведныя пагадненьні.



Х.Саляна падкрэсьліў, што ўсе выгады ад удзелу краіны ў ЭПД выкладзеныя ў дакумэнце «Што Эўрапейскі саюз можа даць Беларусі».

Пры гэтым ён зазначыў, што ў ЭС добра разумеюць важнасьць кантактаў паміж людзьмі і спрабуюць гэтаму спрыяць. «Хаця цана шэнгенскай візы складае 60 эўра, ёсьць прадугледжаныя правіламі ЭС магчымасьці для адмены платы для студэнтаў, выкладчыкаў, дасьледчыкаў», — падкрэсьліў Х.Саляна. Ён зазначыў, што дзяржавы-члены ЭС могуць самастойна прымаць рашэньні пра зьніжэньне або адмену платы за візы для пэўных катэгорыяў грамадзянаў.

Паводле ягоных словаў, Эўрасаюз, выдаючы дакумэнт «Што Эўрапейскі саюз можа даць Беларусі», даслаў рэспубліцы «выразны і ясны сыгнал» пра сваё жаданьне пабудаваць «рэальныя партнэрскія адносіны». «Нас шмат што аб'ядноўвае. ЭС і Беларусь — суседзі, — сказаў Х.Саляна.

Ён падкрэсьліў, што існуе шмат праблемаў, якія выклікаюць заклапочанасьць як у ЭС, гэтак і ў Беларусі. «Мы добра разумеем, што супрацоўніцтва ў галіне энэргетыкі і транспарту было б выгадным для абодвух бакоў», — зазначыў прадстаўнік ЭС.

Аднак, падкрэсьліў ён, партнэрства можа быць пасьпяховым толькі ў тым выпадку, калі яно базуецца на супольных каштоўнасьцях. Паводле словаў Х.Саляны, гэты прынцып застаецца «нарожным каменем» падыходу Эўрасаюзу да стасункаў зь Беларусьсю. «Гэтыя супольныя каштоўнасьці сфармуляваныя галоўным чынам у абавязацельствах АБСЭ, што падпісалі як Эўрасаюз, гэтак і Беларусь, а таксама ў канвэнцыях Рады Эўропы, — зазначыў Х.Саляна. — Шкада, што Беларусь не прызнае гэтыя каштоўнасьці. Мяч цяпер на баку Беларусі. Мы ня пойдзем на кампраміс, калі гэта тычыцца тых каштоўнасьцяў, на якіх заснаваны ЭС».

Гаворачы пра палітычную і сацыяльную сытуацыю ў Беларусі, Х.Саляна зазначыў, што яна «хоча лепшага», асабліва ў пытаньнях дэмакратыі, вяршэнства закону і правоў чалавека. «Але ЭС цьвёрда верыць, што рэалізацыя асноўных эўрапейскіх каштоўнасьцяў зьяўляецца найлепшым і самым эфэктыўным спосабам для руху краіны наперад», — падкрэсьліў прадстаўнік ЭС.

Х.Саляна таксама зазначыў, што паляпшэньне прававых нормаў можа станоўча паўплываць на інвэстыцыйны клімат у Беларусі і дапаможа стварыць «больш надзейную аснову для росквіту і дабрабыту беларусаў».

**Тацяна Каравянкова, БелаПАН**

# 60 хвілінаў без прытомнасьці

Акцыя ў абарону незалежнасьці Беларусі 12 сьнежня скончылася драматычным здарэньнем. У сутычцы з амонам моцна пацярпеў **Зьміцер Хведарук.** Непрытомным яго адвезьлі ў 9–ты клінічны шпіталь. Дактары паставілі дыягназ: страсеньне мозгу. Зьміцер пакуль ня можа размаўляць.

Выйсьці на Кастрычніцкую плошчу ў абарону незалежнасьці 12 сьнежня заклікалі лідэры Партыі БНФ. Акцыя была прымеркаваная да візыту Пуціна. Незалежнікі пратэставалі супраць намераў Пуціна й Лукашэнкі падрыхтаваць і прыняць Канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы.

На Плошчы сабралася каля ста чалавек. Намесьнік старшыні БНФ Алесь Міхалевіч першым разгарнуў бел-чырвона-белы сьцяг. Фактычна адразу да дэманстрантаў падбеглі амапаўцы і пачалі выцясьняць іх.

Як толькі спэцназаўцы разышліся, удзельнікі акцыі пратачыліся назад на Кастрычніцкую, гукаючы: «Незалежнасьць», «Жыве Беларусь». Амапаўцы зноў бралі людзей у кола, адводзілі ад Плошчы, але нікога не затрымлівалі. Так паўтаралася разоў пяць.

Акцыю ачольвалі Баршчэўскі, Вячорка, Лябедзька, Статкевіч.

Урэшце, спэцназаўцы павялі людзеў па праспэкце ў бок плошчы Перамогі. Недалёка ад Сьвіслачы адбылася невялікая бойка. Спэцназаўцы пачалі адбіраць сьцяг у Зьмітра Хведарука. Хлопец не ўтрымаў раўнавагу, паваліўся і ўдарыўся галавой аб асфальт, пасьля чаго па ім пратупала некалькі байцоў.

Каля дваццаці хвілін, пакуль не прыехала хуткая, Хведарук праляжаў на асфальце самлеўшы. Яго адвезьлі ў 9-ы шпіталь. У клініцы хлопец апрытомнеў. Агулам ён правёў без прытомнасьці каля 60 хвілінаў. Дактары канстатавалі, што ў яго страсеньне мозгу. У выніку балявога шоку Зьміцер на момант здачы нумару ня мог размаўляць.

**Зьміцер Панкавец**

# Вэнэсуэла можа стаць беларускім Аўганістанам

«Беларусь зробіць усё, што будзе патрэбна, для забесьпячэньня сувэрэнітэту і бясьпекі Вэнэсуэлы», — гэткую шматзначную заяву зрабіў **Аляксандар Лукашэнка** ў Каракасе.



Ці азначае гэта, што Беларусь будзе ангажавацца ў справы заакіянскай краіны ў такой жа ступені, як у свой час Куба ў Анголе, а ГДР – у Этыёпіі?

Аляксандар Лукашэнка зрабіў такую далёкасяжную заяву пасьля афіцыйнага адкрыцьця супольнага беларуска-вэнэсуэльскага прадпрыемства па здабычы нафты, якое адбылося 8 сьнежня ў вэнэсуэльскім штаце Ансаатэгі.

«Ад імя добрага і талерантнага беларускага народу хачу сказаць, што мы зробім для тваёй краіны ўсё, што ты [Уга Чавэс] скажаш, каб абараніць яе сувэрэнітэт, бясьпеку і незалежнасьць», — цытуе А.Лукашэнку вэнэсуэльскае інфармацыйнае агенцтва ABN.

Як зазначыў А.Лукашэнка, «для нас няма закрытых тэмаў у супрацы». «Мы дамовіліся ўмацоўваць узаемадзеяньне для пабудовы шматпалярнага сьвету і супрацьдзеяньня замежным сілам», — сказаў ён.

А. Лукашэнка заклікаў вэнэсуэльскі народ быць удзячным свайму прэзыдэнту Чавэсу.

Кіраўнік Беларусі паабяцаў стварыць у Вэнэсуэле прадпрыемствы зь перадавымі тэхналёгіямі «не пазьней як за тры гады», — сказаў А.Лукашэнка.

Беларусы хочуць зрабіць з Вэнэсуэлы гіганцкі рынак для сваёй прадукцыі. МТЗ, МАЗ, БЕЛАЗ, будаўнічыя трэсты, праектныя бюро — усе яны мараць знайсьці сабе новы рынак за акіянам. Прыкладна тое самае адбывалася ў савецкі час, калі тысячы спэцыялістаў працавалі ў Альжыры, Мазамбіку, на Кубе і іншых краінах-саюзьніках савецкай імпэрыі. Знаўцы гішпанскай мовы будуць запатрабаваныя.

Але як надоўга?

Параза Чавэса на рэфэрэндуме 3 сьнежня ўраз паставіла пад сумнеў ягоную ўладу і адначасова ягоныя замежнапалітычныя праекты, кшталту супрацы зь Беларусьсю. Апазыцыя адкрыта называе іх вар'яцтвам, задавальненьнем уласных амбіцыяў.

У выпадку падзеньня Чавэса Беларусі няма чаго разьлічваць на дармовую здабычу нафты.

Словы А.Лукашэнкі могуць азначаць, што Беларусь паспрабуе ўплываць на хаду падзеяў у Каракасе. Дагэтуль гаворка ішла толькі пра пастаўку ўзбраеньняў. А ну ж на помач прыйдуць яшчэ вайсковыя дарадцы, выведка і амон.

**Мікола Бугай**

# Элементарна, Вова!

Закід інфармацыі пра Канстытуцыйны акт выгадны Аляксандру Лукашэнку, каб атрымаць больш камфортныя стартавыя пазыцыі на перамовах з Пуціным.

— Бачыце, Ўотсан, — з усьмешкай прамовіў Шэрлак Холмз, калі мы бавілі час на Бэйкер-стрыт за шклянкай віскі з содавай. — Мой дэдуктыўны мэтад цудоўна прыдаецца і для разблытваньня палітычных рэбусаў. Заўжды варта браць увагу на дэталі. Як многа могуць распавесьці ўважліваму назіральніку нязначныя на першы погляд акалічнасьці!

Папыхваючы люлькай, мой сябра разгарнуў сьвежы «Таймз».

— Вось, напрыклад, апошні скандал у беларуска-расейскіх дачыненьнях, — прамовіў Холмз, учытваючыся ў артыкул на другой паласе.

— Чорт, няўжо Расейская імпэрыя адновіцца? — усхапіўся я.

— Не сьпяшайцеся з высновамі, дружа, — супакоіў мяне Холмз, адкінуўшыся на сьпінку фатэля. — Што нам вядома пра гэтую гісторыю?

— Няшмат. 13—14 сьнежня ў Менску будзе падпісаны Канстытуцыйны акт, Уладзімер Пуцін зробіцца прэзыдэнтам «саюзнай дзяржавы», а Аляксандар Лукашэнка — сьпікерам.

— Ўотсан, — дакорліва пахістаў галавой мой сябра. — Менавіта гэта і зьяўляецца найбольш няпэўным і туманным момантам. Але паспрабуем прааналізаваць бясспрэчныя факты. Першай сэнсацыйную навіну паведаміла маскоўская радыёстанцыя «ЭХО Москвы», спасылаючыся на ананімную крыніцу ў атачэньні прэзыдэнта Лукашэнкі. Ня бачу вялікага рэзону для журналістаў хлусіць, што зьвесткі прыйшлі да іх зь Менску. Мяне больш цікавіць той факт, што таямнічы беларускі інфарматар зьвярнуўся менавіта да гэтай радыёстанцыі.

— Магчыма, ён сталы слухач «ЭХО Москвы»? — пацісьнуў плячыма я.

— Мой мілы Ўотсан, — усьміхнуўся Холмз, — за гэты вузельчык трэба брацца з супрацьлеглага боку. Не паглянуйцеся, зазірніце ў маю картатэку ды адшукайце літару «Э». Вы даведаецеся, што «ЭХО Москвы» — гэта, бадай, апошнія з буйных лібэральных этэрных мэдыяў у Расеі. Інфарматар, відавочна, хацеў паўплываць на свавольна настроеныя асяродкі — як у Расеі, так і ў Беларусі. Разьлік быў правільны — інфармацыю «ЭХО Москвы» імгненна падхопліваюць блізкія ёй у настроях лібэральныя расейскія інтэрнэт-сайты, накшталт «Газета.ру», «Newsru.com» і г. д. За імі ў паніку ўпадаюць і беларускія незалежныя мэдыі. А вось афіцыёзны «Інтэрфакс», спасылаючыся на ананімныя крыніцы ў атачэньні Пуціна (які сымэтрычны піяраўскі контраўдар!), называе гэтыя зьвесткі «спэкуляцыйнымі фантазіямі».

Холмз зручна закінуў нагу за нагу і працягнуў свае развагі.

— Ня ведаю, як Вам, Ўотсан, а мне рэжа вочы тое, што пасады гэтак канкрэтна расьпісаныя: Пуцін — прэзыдэнт, Лукашэнка — сьпікер. Расстаноўка для Аляксандра Лукашэнкі, відавочна, нераўнапраўная, прыніжальная. Ведаючы беларускага прэзыдэнта, цяжка ўявіць, што ён згадзіўся на такі варыянт, нават не пагандляваўшыся як сьлед. А дзе, дарэчы, цяпер знаходзіцца містэр Лукашэнка? — нечакана спытаўся Холмз.

— Ня ведаю, — разьвёў я рукамі ў разгубленасьці.

— На іншым баку зямлі, у Паўднёвай Амэрыцы, — трыюмфальна прамовіў Холмз. — Ці не здаецца Вам дзіўным, што прэзыдэнт, які напэўна ведае, што ягоная краіна праз тыдзень-другі навекі зьлеецца з багатым усходнім суседам, а сам ён атрымае цёпленькую пасаду, цягнецца ў Вэнэсуэлу да Уга Чавэса па нафту, якой у Расеі — хоць заліся?

— А што калі інфармацыю ўсё-такі распаўсюдзіў нехта з Крамлю? — засумняваўся я.

— Глыбокая думка, Ўотсан, — задумліва прамовіў Холмз. — Але мне здаецца, што наўрад ці. Містэру Пуціну нявыгадны такі інфармацыйны розгалас перад беларускім візытам, які цяпер немінуча будзе ўскладнены гудзеньнем мэдыяў ды сапсаваны акцыямі пратэсту ў Менску. Ды гэта і ня ў стылі новага расейскага цара. Куды эфэктней (і гэта было б цалкам у Пуцінскай манеры — спачатку зрабіць, а потым сказаць) абвесьціць сэнсацыйныя зьвесткі ўжо пасьля таго, як зьліцьцё краінаў будзе зацьверджанае. Уявіце сабе, што пасьля ўсіх выкідаў інфармацыі ды афіцыйных зьняпраўджаньняў, прэзыдэнты ўсё-такі падпішуць той акт ды разьмяркуюць пасады. Гэта, прабачце, будзе выглядаць, як анэкдот. А Пуціну цяпер не да жартаў.

— Але якую з гэтага можна зрабіць выснову?

— Ўотсан, для мяне амаль бясспрэчна тое, што гэтая сэнсацыйная інфармацыя (ці дэзынфармацыя) сапраўды зыходзіла зь беларускага боку, а не з расейскага. Яе мэта — ускладніць Пуціну вядзеньне перамоваў з Лукашэнкам. Што да адказу на пытаньне «Qui bono? Qui prodest?», то я пакуль што маю дзьве гіпотэзы. Першая: закід інфармацыі выгадны самому Аляксандру Лукашэнку, каб атрымаць больш камфортныя стартавыя пазыцыі на перамовах з Пуціным. Зьяўленьне сэнсацыі менавіта тады, калі беларускага прэзыдэнта няма ў краіне, заўсёды дае яму магчымасьць вывучыць рэакцыю і, вярнуўшыся дадому, дзейнічаць у залежнасьці ад сытуацыі. Калі перамовы праваляцца, Расея абавязкова ўзмоцніць эканамічны ціск на Беларусь. Але цяпер Аляксандар Лукашэнка зможа ў многім нэўтралізаваць нэгатыўнае стаўленьне да сябе ў краіне — маўляў, зноў нас Крэмль хацеў жыўцом зьесьці, а я не паддаўся.

— Гучыць вельмі пераканаўча! — у захапленьні ўсклікнуў я.

— Не сьпяшайцеся, Ўотсан, ёсьць яшчэ і другая гіпотэза. Закід інфармацыі мог быць сюрпрызам як для Пуціна, так і для Лукашэнкі. Ня выключана, што чуткі распусьцілі людзі з атачэньня беларускага прэзыдэнта, якія не зацікаўленыя ў саюзе з Расеяй. Тыя, хто баіцца, што іхны ўплыў катастрафічна зьнізіцца, калі давядзецца на роўных канкураваць з цынічнымі ды багатымі крамлёўскімі варацiламі.

— Дык гэтая сэнсацыя — пустышка? — расчаравана ўздыхнуў я.

— На жаль, на падставе гэтых дэталяў я пакуль што не магу адказаць на

гэтае пытаньне, — адказаў Холмз. — Няясна, ці то беларускі бок выпусьціў у сьвет поўную прыдумку, ці, валодаючы пэўнай інфармацыяй, вырашыў зьмяшаць карты на перамовах. Ня выключана, што беларусы проста атрымалі са сваіх крамлёўскіх крыніцаў зьвесткі пра тое, які вынік перамоваў максымальна задаволіў бы Пуціна (ці спрагназавалі яго) — і вырашылі загадзя дыскрэдытаваць такі варыянт. Няма дыму без агню: Пуцін напэўна будзе выкручваць беларусам рукі. Але для панікі таксама няма падставаў. Я схіляюся да таго, што ніякай строгай дамоўленасьці паміж Пуціным ды Лукашэнкам няма.

Холмз узьняўся, падышоў да акна ды адсунуў фіранкі.

— У любым выпадку, я ўпэўнены, што ключ да гэтай таямніцы варта шукаць недзе ў Менску. Ўотсан, будзьце ласкавыя, зірніце на апошняй старонцы «Таймз» прагноз надвор’я для Ўсходняй Эўропы. Дарэчы, калі я не памыляюся, гэты кэб ля ганку ўжо чакае нас.

**Сэр Алесь Кудрыцкі**
**14:27, 8 сьнежня 2007**


ФЭРНАНДА БАТЭРА. CUADRILLA DE ENANOS TOREROS

КАМЭНТАР

## Лукашэнкаўцам мову адняло

**Працяг са старонкі 3.**

А. Лукашэнку, чые інтарэсы безадмоўна праводзяць беларускія нібыта «дзяржаўныя» СМІ.

Ужо ня кажучы пра сам факт ратацыі кіраўніцтва Расеі. Лукашэнкаўцы ў глыбіні душы спадзяюцца на трэці тэрмін Пуціна. На тле яго сам Аляксандар Рыгоравіч не здаваўся б выключэньнем з нормы. Камэнтатары прадказваюць, што Мядзьведзеў будзе «зьбіраць грошы» яшчэ больш жорстка за Пуціна і што беларусам прыйдзецца разьвітацца зь некаторымі расейскімі прэфэрэнцыямі. Са словаў нямецкага палітоляга Аляксандра Рара, Лукашэнку будзе цяжэй знаходзіць супольную мову з кожным новым прэзыдэнтам Расеі хоць бы ў сілу таго, што гэта зьменныя кіраўнікі.

**Барыс Тумар**

# Калядны нумар «НН»

Калядны нумар «НН» з вынікамі году і традыцыйным цыклам «Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў» выйдзе 26 сьнежня. Хочаце, каб Ваш твор трапіў у Калядны нумар? Дасылайце іх на мэйл: nn@promedia.by ды nn@nn.by або поштай: а/с 537, Менск, 220050 не пазьней за 20 сьнежня.

### Прэзэнтацыя новых кніг ARCHE і «НН» у Горадні

У чацьвер, 20 сьнежня, у Горадні (сядзіба Таварыства беларускай школы, вул. Будзёнага 48 а) адбудзецца адзіная рэгіянальная прэзэнтацыя спэцыяльнага праекту ARCHE Беларусь: ні Расея, ні Эўропа. Меркаваньні беларускіх эліт”. Прысутных чакае сустрэча з адным з аўтараў кнігі, дырэктарам Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў Віталем Сіліцкім, і галоўным рэдактарам часопісу ARCHE Валерам Булгакавым. Плянуецца раздача выданьня. Пачатак а 18.30.

# МВФ прагназуе эканамічны крызіс у нашым рэгіёне

Міжнародны валютны фонд (МВФ) папярэджвае краіны Балтыі і Паўднёва-Ўсходняй Эўропы, у тым ліку Ўкраіну, што яны могуць стаць месцам наступнага буйнамаштабнага эканамічнага крызісу, паведамляе ўкраінскае выданьне «Дзеркало тижня».



Дырэктар эўрапейскага дэпартамэнту МВФ Майкл Дэплер адзначае, што «некалькі краінаў насамрэч дэманструюць такія ж сымптомы, як і шэраг азіяцкіх краінаў напярэдадні рэгіянальнага фінансавага крызісу, што здарыўся дзесяць год таму».

Паводле эканаміста, трывогу выклікае дэфіцыт наяўных рахункаў, што фінансуецца за кошт замежных сродкаў, а таксама рост узроўню запазычанасьці прыватнага сэктару. Да ўсяго, адзначае Дэплер, асобныя краіны з найвастрэйшай праявай гэтых сымптомаў трымаюцца рэжыму фіксаванага абменнага курсу.

Дырэктар дэпартамэнту ня лічыць сытуацыю цалкам аналягічнай той, што склалася ў Азіі ў 1997 г. На ягоную думку, давер інвэстараў да якасьці кіраваньня эканомікамі вышэйазначаных краінаў значна вышэйшы, як да краінаў Азіі ў часе крызысу. Тым больш, што паўднёваэўрапейскім краінам надае аптымізму фактычнае або патэнцыйнае сяброўства ў Эўрасаюзе.

Аднак экспэрт перасьцерагае: шэраг краінаў дэманструе неапраўданую залежнасьць ад замежнага фінансаваньня, што робіць іх эканомікі занадта ўразьлівымі да нечаканых збояў. У зьвязку з гэтым МВФ рэкамэндуе ўстрымацца ў бліжэйшы час ад стымуляваньня спажывецкага буму, рухавіком якога стаў прыватны сэктар эканомікі. Неабходны таксама кантроль у банкаўскай сфэры.

МВФ раіць краінам рэгіёну нарошчваць эфэктыўнасьць сваіх эканомік шляхам рэфармаваньня. Толькі такім чынам можна запэўніць інвэстараў у слушнасьці ўкладаньняў у эканоміку краінаў.

Як адзначае Газета.ru, Расеі падобны крызіс не пагражае. Паводле Цэнтрабанку рахунак бягучых апэрацыяў плацёжнага балянсу Расеі станоўчы. Да таго ж, чакаецца беспрэцэдэнтны прыплыў прыватнага замежнага капіталу ў РФ. Пра давер да краіны сьведчыць таксама прыплыў сродкаў у замежныя фонды, што інвэстуюць ў краіны СНД і Расею.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Інфляцыя за 2007 год складзе двухзначную лічбу

Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Індэкс спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі ў студзені — лістападзе склаў 109,4%.

У адпаведнасьці з Асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2007 год гадавая інфляцыя заплянавана ў межах 6—8%.

### Разгляд праекту бюджэту адклалі на просьбу Лукашэнкі

Бюджэт краіны на наступны год будзе зацьверджаны ў канцы сьнежня, калі стане вядомай цана расейскага газу. Паводле старшыні палаты прадстаўнікоў Вадзіма Папова, затрымка з разглядам праекту бюджэту выкліканая асабістым пажаданьнем Аляксандра Лукашэнкі «падкарэктаваць некаторыя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі».

### Новыя беларускія цэмэнцярні будуць узводзіць кітайскія будаўнікі

Будаўніцтва новых заводаў па вытворчасьці цэмэнту будзе пачата ў лютым 2008 г., паведаміў міністар архітэктуры і будаўніцтва Аляксандар Селязьнёў. Чакаецца, што да таго часу надыдуць крэдытныя сродкі з Кітаю ў памеры $30 млн, а таксама крэдыт Беларусбанку на $70 млн. У красавіку—траўні маюць прыйсьці яшчэ $100 млн з Кітаю. Напэўна, будаваць цэмэнтныя заводы будуць кітайскія будаўнікі. Беларускія будуць занятыя ў Вэнэсуэле.

Заводы запрацуюць, бадай, у першым паўгодзьдзі 2010 г.

### Nokia Siemens Networks адкрыла прадстаўніцтва ў Беларусі

Сярод кліентаў кампаніі — «Белтэлекам», МТС і Velcom, Беларуская чыгунка, канцэрн «Белнафтахім», «Белэнэрга», «Гомельтранснафта «Дружба». Кампанія распрацоўвае праекты з існуючымі апэратарамі па ўкараненьні лічбавага інтэрактыўнага тэлебачаньня ў сетках перадачы дадзеных паводле пратаколу IP (IPTV). У плянах таксама ўкараненьне бесправаднога доступу да сетак перадачы дадзеных паводле тэхналёгіі WiMAX.

Nokia Siemens Networks — вядучы сусьветны правайдэр камунікацыйных паслуг і пастаўшчыкоў тэлекамунікацыйнага абсталяваньня. Штат налічвае каля 20 тыс. спэцыялістаў у галіне паслугаў па ўсім сьвеце. Штаб-кватэра знаходзіцца ў Эспа (Фінляндыя).

**СП; інф. БЕЛТА**

# То кіем, то ласкай

Кацярыну Салаўёву аднавілі ва ўнівэрсытэце.

Пра аднаўленьне Кацярыны Салаўёвай паведаміў рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту З.Лазоўскі, выклікаўшы Касю на неафіцыйную размову. Але з адной умовай — да першага затрыманьня альбо правапарушэньня. З словаў К. Салаўёвай, яна не чакала такога павароту падзеяў.

«Я дзівуюся, бо, здаецца, такіх выпадкаў яшчэ не было. Думаю, што паўплывала шырокая грамадзкае абурэньне», — усьміхаецца дзяўчына.

**Буг**



## СЬЦІСЛА

### Суд над Фінькевічам прызначаны на 20 сьнежня

Ён пачнецца у 10.30. Фінькевічу прад'яўлена абвінавачаньне па арт. 415 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі). Юнак ад 2006 году сядзіць за нанясеньне на сьцены графіці «Мы хочам новага!».
90 грамадзкіх дзеячоў, сярод якіх Уладзімер Арлоў, Аляксандар Мілінкевіч, Ніл Гілевіч накіравалі судзьдзю ліст, у якім зьвяртаюцца да ягонага сумленьня.

### Падтрымліваеш свабоду і дэмакратыю? Дай сыгнал!

У сеціве зьявіўся сайт на польскай мове «Падай сыгнал!». Ён запрашае далучацца да падтрымкі свабоды і дэмакратыі ў Беларусі явачным спосабам: упісаць сваё імя і пакінуць камэнтар. А яшчэ ягоныя аўтары заклікаюць падаваць сыгнал, калі ўзбоч дарогі ўзьнікне бігборд з рэклямай акцыі або каля беларускага пасольства.

### Пэнсіянэры скупляюць лекі

Да скасаваньня амаль усіх льготаў засталіся лічаныя дні. Таму многія пэнсіянэры скупляюць у аптэках лекі па льготных цэнах.

### Экс-прэзыдэнт Пэру атрымаў шэсьць гадоў турмы

Былы прэзыдэнт Пэру Альбэрт Фухіморы асуджаны на шэсьць гадоў турмы за злоўжываньне ўладай. Фухіморы прызналі вінаватым ў тым, што загадаў свайму памагатаму выкрасьці з дому кіраўніка службы выведкі дакумэнты, якія сьведчылі пра карупцыю ва ўрадзе.
Адначасова працягваецца суд па абвінавачаньні Фухіморы ў тым, што ён падчас прэзыдэнцтва ў 1990—2000 гадах аддаваў загады пра забойствы і выкраданьні, калі ішла барацьба зь левымі паўстанцамі. Тады загінулі 25 чалавек.

**буг; АК**

# Нафтаправод «Адэса—Броды» запрацуе авэрсна ў 2008-м

Украіна і Польшча плянуюць запусьціць нафтагон «Адэса—Броды» ў авэрсным рэжыме ў сярэдзіне 2008 году. Пра гэта, як паведамляе прэс-служба кіраўніка ўкраінскай дзяржавы, заявілі прэзыдэнты Віктар Ючшанка і Лех Качыньскі ў Адэскай вобласьці пасьля наведваньня марскога нафтавага тэрміналу «Паўдзённы».

«Пачаткам рэалізацыі гэтага праекту, у тым разуменьні, як мы сёньня казалі, я бачыў бы сярэдзіну 2008 году. Мы маем усе падставы цьвёрда пра гэта заяўляць», — сказаў В. Ючшанка. Ён удакладніў, што першы этап такога выкарыстаньня нафтаправоду прадугледжвае транспартаваньне нафты ў авэрсным рэжыме да Бродаў — а з гэтага адпраўнога пункту яна будзе пераваізіцца чыгункаю.

Прэзыдэнт Украіны таксама паведаміў, што, згодна з плянам разьвіцьця гэтага праекту, у сьнежні 2007 году адбудзецца фармаваньне статутнага фонду СП «Новая Сарматыя», у красавіку будзе зацьверджанае тэхнічна-эканамічнае абгрунтаваньне праекту з тым, каб ужо ў траўні гэтая кампанія магла выйсьці на рынак замежных пазычаньняў і зьвярнуцца па пазыкі да ЭБРР.

«Я чакаю, што падчас Энэргетычнага саміту ў Кіеве можна будзе пабачыць першы этап працы энэргаправоду «Адэса—Броды», — сказаў прэзыдэнт Польшчы. На ягоную думку, дабудова нафтагону да Гданьску магчымая ў 2011—2012 гадах. «Калі б не палітыка, праект «Адэса—Броды» працаваў бы ўжо не адзін год», — таксама адзначыў прэзыдэнт Украіны.

Прэзыдэнт Украіны падпісаў указ пра правядзеньне ў траўні 2008 году ў Кіеве Міжнароднага энэргетычнага саміту, які, паводле ягоных перакананьняў, завершыць усю лягістыку, зьвязаную з рэалізацыяй праекту «Адэса—Броды—Плоцк—Гданьск».

**НХ, unian.net**

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»

# Апошні месяц па старых цэнах!

Толькі да праваслаўных Калядаў (7 студзеня) кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» будуць прадавацца па старых цэнаў. З 2008 году цэны павышаюцца на 50 %. Зрабі падарунак сабе, а нават сваім унукам.

Замаўляйце кнігі праз
029-505-39-11
029-126-36-87
knihi@me.by




**Вясна народу:** Эсэістыка 1991—2007




**Віталь Тарас. Звыклае зло.** Зборнік эсэ.




**Застаемся!** Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае




**Сямён Печанко. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.

Увага! Засталіся апошнія дзесяць асобнікаў!




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове




**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.




**Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by.** Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.

Увага! У продажы застаецца апошняя сотня асобнікаў!




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991—2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы». Гэта апавяданьні Вячаслава Адамчыка, Уладзімера Арлова, Ігара Бабкова, Васіля Быкава, Лявона Вольскага, Адама Глёбуса, і іншых — усяго 30 аўтараў.




**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Тацьцяны Барысік, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых.




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**
У сваіх мэмуарах, поўных важкіх дэталяў і трапных апісаньняў, пісьменьнік запрашае нас у прастору, дзе жылі Якуб Колас, Уладзімер Караткевіч, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц...
Гэта ўнікальны летапіс быцьця душы, што праходзіць праз вайну і мір, жыцьцё і сьмерць, сяброўства і здраду, напісаны паўзьверх старонак гісторыі СССР, Эўропы, Беларусі...

ш у к а й ц е ў к н і г а р н я х і ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў




**Каляндар на 2008 год**

**са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча**.




**Пётра Краўчанка. Беларусь на ростанях:** Нататкі дыплямата і палітыка




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.** Кніга падарожных эсэ.




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.** У кнзе сабраныя лісты, якія Павал Севярынец ад верасьня 2005 да ліпеня 2007 дасылаў у "Нашу Ніву" з Малога Сітна — есца сваёй высылкі.




**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

с э р ы я з а с н а в а н а я ў г о н а р 1 0 0 – г о д з ь д з я « Н а ш а й Н і в ы »

# У змаганьні Вячоркі і Міхалевіча перамог Баршчэўскі

Лявон Баршчэўскі вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду старшыні Партыі БНФ і быў падтрыманы дэлегатамі аднагалосна пасьля таго, як галасы падзяліліся пароўну між Вячоркам і Міхалевічам. Зьмена на чале партыі адбылася, але не на карысьць наймаладзейшага пакаленьня. Партыю ўзначаліў палітычны старажыл, які мае вялікі грамадзкі аўтарытэт і ў той жа час дасьведчаны ў апаратных гульнях. Можна чакаць, што роля Партыі БНФ у Аб'яднаных дэмакратычных сілах узрасьце, а кааліцыя АДС захаваецца.

## Субота

Працу Дзясяты зьезд Партыі БНФ пачаў традыцыйна — з выкананьня гімну «Магутны Божа». Над сцэнай вісеў вялікі бел-чырвона-белы сьцяг.

Першаму слова далі старшыню партыі Вінцуку Вячорку, які зрабіў невялікую справаздачу па працы Партыі за апошнія два гады. Ён адразу прапанаваў ушанаваць хвілінаў маўчаньня тых фронтаўцаў, які за гэты тэрмін пайшлі з жыцьця — Кастуся Мысьліўца, Тамару Грузнову, Цімоха Вострыкава. Таксама Вячорка зачытаў вершаванае прывітаньне ад народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: «Ад сэрца жадаю Народнаму Фронту / Застацца адзіным без капрамонту».

У заслугі БНФ Вячорка паставіў тое, што Партыя зрабіла Мілінкевіча адзіным кандыдатам ад апазыцыі. Вячорка таксама перакананы, што асноўную працу на тых выбарах зрабілі фронтаўцы. У актыў Партыі старшыня занёс і сёлетнія мясцовыя выбары.

Віктар Івашкевіч зрабіў акцэнт у сваім выступе на ўдалых вулічных акцыях. Алесь Міхалевіч расказаў пра сваю падтрымку рэгіянальным структурам БНФ, а таксама звольненым з працы фронтаўцам.

Ужо ў першым выступе ў спрэчках Галіна Сямдзянава прапанавала, каб Партыя БНФ вылучыла свайго кандыдата на наступных прэзыдэнцкіх выбарах. Алег Юркін зрабіў удакладненьне, каб гэтае вылучэньне адбывалася ў рамках Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Дэлегаты зьезду ўхвалілі гэтыя прапановы.

З вуснаў выступоўцаў гучала багата крытыкі, як у бок Міхалевіча, так і Вячоркі. У падтрымку Віктара Івашкевіча выступіў толькі Кастусь Смолікаў зь Віцебску.

Надышоў час галасаваньня. Вынікі першага туру аказаліся наступнымі: Вячорка — 107 галасоў, Міхалевіч — 104, Івашкевіч — 26. Івашкевіч, які выбыў з гонкі, перад другім турам падтрымаў Вячорку. Аднак ня ўсе ягоныя прыхільнікі зрабілі тое самае. Вячорку для перамогі забракла чатырох галасоў: за яго прагаласавалі 118 дэлегатаў, за Міхалевіча — 110. Паводле статуту Партыі пераможцам абвяшчаецца кандыдат, які набраў 50% плюс адзін голас. На гэтым зьезьдзе такім кворумам быў бы вынік у 122 галасы.

Партыя аказалася ў патавай сытуацыі, якая нагадала фатальны зьезд 1999 году, што скончыўся расколам. Тады таксама ніхто з кандыдатаў не набраў больш за 50% галасоў.

## Нядзеля

Другі дзень зьезду пачаўся з сэнсацыі. Лявон Баршчэўскі выйшаў на трыбуну і прапанаваў сябе на пасаду старшыні Партыі БНФ. Заля сустрэла ягоную заяву апладысмэнтамі.

Гэтаму папярэднічала напружаная кулюарная барацьба. Уладзімер Лабковіч прапанаваў унесьці зьмены ў рэглямэнт, каб старшыню абіраць простай большасьцю галасоў, а не паводле схемы 50% + 1 голас. Юры Губарэвіч выказаўся за тое, каб празь нейкі час правесьці другую сэсію зьезду. Міхалевіч прапанаваў вызначыць кампрамісную кандыдатуру на старшыню. Баршчэўскі вырашыў: трэба ўратаваць сытуацыю.

Яму, былому дэпутату Вярхоўнага Савету і выканаўцу абавязкаў старшыні БНФ пасьля эміграцыі Пазьняка, не займаць палітычнага досьведу. А як удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху і адзін з заснавальнікаў Беларускага ліцэю, Баршчэўскі мае неаспрэчны маральны аўтарытэт.

Мінулыя 8 гадоў ён ухіляўся ад палітычнае дзейнасьці. Аднак уначы з суботы на нядзелю вымушаны быў вярнуцца.

Вячорка падтрымаў Баршчэўскага. А Міхалевіч заявіў, што здымае сваю кандыдатуру на карысьць Баршчэўскага. У бюлетэні для галасаваньня


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Баршчэўскі прыняў кіраўніцтва як цяжкі груз.

**Лявон Баршчэўскі**

нарадзіўся 4 сакавіка 1958 у Полацку. Скончыў Менскі пэдагагічны інстытут замежных моваў на спэцыяльнасьці нямецкая і ангельская мовы, пасьля асьпірантуру пры Менскім пэдынстытуце замежных моваў. Кандыдат філялягічных навук. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савету 12 скліканьня ад Наваполацку. У 1996—1999 выконваў абавязкі старшыні Партыі БНФ. Заснавальнік і намесьнік дырэктара Беларускага гуманітарнага ліцэю. Перакладаў больш як з трыццаці моваў. Гаворыць на сямі мовах.



Пагаворваюць, што Баршчэўскі хацеў бы праз два гады перадаць лейцы Аляксею Янукевічу.



Алесь Міхалевіч ня мае намеру спыняцца.

# Віталь Цыганкоў: Разьняволіцца б нашым палітыкам...

Калі б нейкі далёкі ад палітыкі чалавек увайшоў у залю ДК МАЗ падчас выступу Вінцука Вячоркі, ён бы ніколі не падумаў, што прамаўляе лідэр партыі, палова якой хоча ягонай адстаўкі. Ніякія абставіны ня могуць зьмяніць непахісны вячоркаўскі стыль — сухі, бездакорны, прафэсарскі. Не было аніякіх рытарычных прыёмаў, эмацыйных усплёскаў, удалых жартаў. Нават у такой крытычнай сытуацыі Вячорка не пажадаў (альбо ня здолеў) вырвацца за рамкі свайго палітычнага падыходу, палітычнага тэмпэрамэнту.

Што павінен такога зрабіць кіраўнік партыі, каб заслужыць наступныя словы ад дэлегата Андрэя Юркова: «Ня ведаю, ці зробіць лепш замена лідэра, але ведаю, што горш ня будзе».

Калі кажуць, што ў Вячоркі няма харызмы, то, здаецца, у Міхалевіча яе яшчэ менш. Ці, можа, ягоныя прыхільнікі лічаць, што яна можа раскрыцца толькі на пасадзе старшыні? Затое дакумэнты ягоныя на зьездзе былі падрыхтаваныя, як у добрай рэклямнай брашуры, пра героя выказваюцца вядомыя людзі — Мілінкевіч, Севярынец, старшыня «Бацькаўшчыны» Макоўская, лідэр прадпрымальнікаў Шумчанка. Міхалевіч дзейнічае тэхналягічна, ён размаўляў пэрсанальна ці ня з кожным дэлегатам зьезду, ён абяцае, што падчас ягонага кіраўніцтва БНФ павінен прыйсьці да ўлады. У Вячоркі, відаць, не хапае нахабства абяцаць такое...

Але, як сказаў гарадзенскі дэпутат Сяргей Мальчык, «шэры кардынал ня можа стаць каралём»...

Пасьля гэтага зьезду БНФ Фронт не застанецца тым самым.

**Віталь Цыганкоў, радыё «Свабода»**

ўнесенае толькі адно прозьвішча. Вынік: «за» 211 дэлегатаў з 236.

Такім чынам, зьмена на чале Партыі БНФ адбылася, але яшчэ не на карысьць маладзейшага пакаленьня. Партыю ўзначаліў палітычны старажыл, які мае вялікі грамадзкі аўтарытэт і ў той жа час дасьведчаны ў апаратных гульнях.

## Намесьнікі

Хоць Баршчэўскі не прапанаваў у намесьнікі ніводнага з «абнаўленцаў», зьезд вырашыў інакш.

У выніку галасаваньня першым намесьнікам, намесьнікам у міжнародных справах абралі Вячорку. Намесьнікам па рэгіянальнай палітыцы стаў Губарэвіч, які перамог Сяргея Мальчыка. Намесьнікам старшыні ў справах інфармацыйна-ідэалягічнай працы выбралі Аляксея Янукевіча. Саступіў яму Ігар Лялькоў. Івашкевіч займецца арганізацый палітычных кампаніяў і працай з мэтавымі групамі. Партыйнае будаўніцтва і сувязь з палітычнымі суб’ектамі ачоліць Міхалевіч, які перамог Лабковіча.

Новаабраны старшыня заявіў, што зьбіраецца працаваць на пасадзе старшыні толькі два гады як антыкрызысны мэнэджэр і што радыкальных зьменаў у партыі ня будзе.

**Зьміцер Панкавец, Сямён Печанко**

## Баршчэўскі хоча сустрэчы з Радзьковым

Лявон Баршчэўскі падрыхтаваў ліст да старшыні грамадзкага аб’яднаньня «Белая Русь» з просьбай асабістай сустрэчы. Аб гэтым новаабраны старшыня Партыі БНФ паведаміў сёньня на сваёй першай прэс-канфэрэнцыі.

Баршчэўскі заявіў, што сустрэча патрэбная, каб паставіць перад міністрам адукацыі сур’ёзныя пытаньні. Па-першае, гэта нізкі ўзровень выкладаньня ў школах гісторыі Беларусі. «Становішча значна пагоршылася. Цяпер да нас прыходзяць абітурыенты, ў якіх «дзявяткі» ў атэстаце, а яны ня ведаюць, у якім стагодзьдзі была заключаная Люблінская унія», — кажа Баршчэўскі. Другое сур’ёзнае пытаньне — рэпрэсіі супраць палітычна актыўных школьнікаў і студэнцтва, «за якія міністар адукацыі адказвае непасрэдна».

«Раней Радзькоў пазьбягаў сустрэчаў, нават ад ліцэістаў зьбег праз чорны ход. Цяпер ён заявіў, што гатовы да дыялёгу з апазыцыяй. І мы прымусім яго не ігнараваць нас. Калі ўжо ён стаў кіраўніком «Белай Русі», то цяпер мы можам сустрэцца і як прадстаўнікі грамадзкіх аб’яднаньняў», — заявіў Баршчэўскі.

**Яраслаў Сьцешык**

# Ідэалёгія патрабуе чысьціні

Паездка за мяжу сталася падставаю для звальненьня выкладчыка ў Баранавічах.



Кіраўніцтва Баранавіцкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (БарДУ) 26 лістапада не працягнула кантракт са старэйшым выкладчыкам катэдры філязофіі й гісторыі Анатолем Трафімчыкам.

Афіцыйна кантракт не працягнуты за парушэньне дысцыпліны. Трафімчык напрыканцы 2006 году зьезьдзіў у Вільню на канфэрэнцыю гісторыкаў без дазволу рэктарату. Гэта палічылі за палітычную дзейнасьць.

Рэктар Васіль Качурка ў прыватнай гутарцы патлумчыў Анатолю Трафімчыку, што афіцыйна ён выключаны за адсутнасьць на працы, але ў сапраўднасьці — за палітычную дзейнасьць.

Анатоль зьяўляецца кандыдатам гістарычных навук, абараняўся ў Інстытуце гісторыі НАН Украіны. На Бацькаўшыне такі дыплём не прызнаны. Таму ад заснаваньня БарДУ пачынаў працу дацэнтам. Потым быў «разжалаваны» да старэйшага выкладчыка. Адбылося тое амаль адразу пасьля ягонага камэнтара пра бальшавіцкую кастрычніцкую рэвалюцыю для незалежнага баранавіцкага тыднёвіка INTEX-PRESS.

Пра тое, што адбылося потым, расказвае сам Трафімчык:

— Пасьля, у верасьні 2007 году, рэктар не пусьціў мяне ў Польшчу, куды я быў запрошаны на канфэрэнцыю. Сказаў, што, маўляў, звольнім, тады і паедзеш. Рэктар закідаў мне публікацыі ў недзяржаўных выданьнях, такіх як ARCHE, баранавіцкім INTEX-PRESS ды «Ганцавіцкім Часе». На думку Кучуркі, такое нельга рабіць выкладчыку дзяржаўных установаў. Зразумела, гэта не пісалася ў пратаколе камісіі. Было, аднак, зазначана, што, як выкладчык і навуковец, я задавальняю ўнівэрсытэт. Але ідэалёгія патрабуе чысьціні.

Даўно вядома, што ў правінцыі чынавенства больш адчувае залежнасьць ад менскіх уладаў. Паглядае са страхам і трапятаньнем на сталіцу. Засьцерагаецца… Як страшэнная показка, у Баранавічах па людзях ходзіць байка, як чынавенства ўнівэру першы тост на Новы 2007 год выпіла за Лукашэнку. Дадаўшы, што безь яго яны дасюль былі б нікім. Выпівалі, зразумела, стоячы…

Сам Трафімчык з гумарам камэнтуе падзеі, што адбыліся зь ім:

— Кіруючыся лёгікай Качуркі, паводле якой ён робіць мяне апазыцыянэрам за паездку за мяжу, можна прыйсьці да жахлівых высноваў, бо, па-першае, само кіраўніцва БарДУ езьдзіць за мяжу нашмат часьцей за мяне. Падругое, яны абвінавачваюць мяне ў апазыцыйнасьці на падставе маіх публікацыяў. Але я друкаваўся і ў часопісе Адміністрацыі прэзыдэнта «Беларускай Думцы» — артыкул пра інсцэнізацыю Міколкі-Паравоза. Ці, можа, БД таксама апазыцыйная? А як патлумачыць, што кіраўніцва БарДУ не чытае БД, але чытае апазыцыйныя СМІ? Па-трэцяе, сваімі дзеяньнямі яны выштурхоўваюць мяне ў палітычнае поле апазыцыі. Раней я ў сваіх дзеяньнях намагаўся быць апалітычным. Каму гэта выгадна — уладзе ці апазыцыі?

На мае пытаньне, ці не сталася беларуская мова, якой заўсёды карыстаецца Анатоль, падставаю для звальненьня, Трафімчык адказаў:

— Пра гэта ніхто адкрыта ня згадваў. Праўда, па ўстанове даўно хадзілі чуткі, што «вот он разговаривает на беларускай мове». Сярод выкладчыкаў я нават атрымаў мянушку — «Беларус». Студэнты ж ставяцца да мовы на лекцыях нармальна. Дарэчы, для іх я — "гісторык" ці "філёзаф", у залежнасьці ад выкладаных дысцыплінаў. Альбо «Трафім»…

Па сканчэньні кантракту, з 1 сьнежня, Анатоль зьбіраецца адпачыць ад таго маразму, што перасьледуе яго ўжо год. Хоча паваляцца на печы ў бацькоўскай хаце, што ў вёсцы Вялікія Круговічы Ганцавіцкага раёну.

Адначасова будзе займацца сыстэматызацыяй свайго навуковага патэнцыялу. На сёньняшні дзень сасьпела патрэба ў дапісаньні дзьвюх манаграфіяў па гісторыі 1-й паловы XX стагодзьдзя і дзьвюх навукова-папуляных манаграфіяў. Раней неставала часу. Са словаў Анатоля, ён ужо мае прапановы працы за межамі Беларусі. Ад Нямеччыны да Літвы. Будзе час на прыняцьце рашэньня.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

**4 сьнежня**

### Клімаў сустрэўся зь сям'ёй

Жонка палітвязьня **Андрэя Клімава** Таццяна правяла тры дні ў Мазырскай калёніі на доўгатэрміновым спатканьні з мужам. Тым часам Дэпартамэнт выкананьня пакараньняў МУС паведаміў, што стан здароўя А. Клімава ў калёніі ацэньваецца як здавальняльны. У лісьце, які выканаўца абавязкаў начальніка ДВП МУС **Юры Барынкоў** накіраваў у адказ на запыт старшыні АГП **Анатоля Лябедзькі**, адзначаецца, што асуджаны А.Клімаў прыбыў у калёнію 13 кастрычніка і быў узяты на дыспансэрны ўлік з дыягназам «ішэмічная хвароба сэрца, стэнакардыя».

### Затрымалі за стужачкі

Каля ўнівэрсаму «Берасьце» была затрыманая актывістка кампаніі «Jeans — за Свабоду!» **Вольга Гулякевіч**. Дзяўчына завязвала сінія стужачкі на слупы ўздоўж праспэкту Газэты «Звязда». Супрацоўнікі міліцыі, якія затрымалі яе, не прадставіліся і патрабавалі адключыць сотавы тэлефон. Вольгу адвезьлі ў ГАМ №1 Маскоўскага раёну і вызвалілі толькі празь дзьве гадзіны, сканфіскаваўшы стужкі, якія яшчэ заставаліся.

**5 сьнежня**

### Апісалі тавар

У **Аляксандра Макаева**, аднаго зь лідэраў прадпрымальніцкага руху і заяўніка мітынгу прадпрымальнікаў 10 сьнежня, апісалі ўвесь тавар на рынку «Ждановічы». Тавар на суму 2 тысячаў даляраў застаўся на захаваньні ўладальніка бяз права продажу. Прадпрымальніцкую дзейнасьць Макаева праверыць АБЭЗ. Сам прадпрымальнік зьвязвае гэта з падрыхтоўкай да мітынгу прадпрымальнікаў.

**6 сьнежня**

### Хадэкам адмовілі ў рэгістрацыі

Аргкамітэт па стварэньні грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» атрымаў зь Міністэрства юстыцыі адмову ў рэгістрацыі. Заяўнікі нібыта не патлумачылі ў статуце арганізацыі сутнасьць хрысьціянскіх каштоўнасьцяў, а таксама тое, як БХД будзе іх адстойваць. Аргкамітэт у сувязі з гэтым рыхтуе скаргу.

### Сканфіскавалі рызограф і 5000 улётак

У вынікуператрусу на офісе Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў былі сканфіскаваныя рызограф і 5000 тысячаў улётак, у якіх быў заклік прыйсьці на акцыю прадпрымальнікаў 10 сьнежня. Аднаго зь лідэраў прадпрымальніцкага руху **Аляксандра Макаева**, а таксама моладзевых актывістаў **Алега Корбана**, **Міколу Сяргеенку** і **Надзею Сінькевіч** адвезьлі ў РУУС Ленінскага раёну. Дзяўчыну адпусьцілі, а на ўсіх астатніх склалі адміністрацыйныя пратаколы за лаянку, пасьля чаго іх таксама вызвалілі. Суд над усімі траімі прызначаны на 12 сьнежня аб 11:00 у судзе Ленінскага раёну (вул.Сямашкі,33).

**7 сьнежня**

### КХП-БНФ пагражаюць ліквідацыяй

Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджаньне Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ. Партыйцаў папярэдзілі пра недапушчальнасьць распальваньня міжнацыянальнай варожасьці. Падставай для папярэджаньня стаў ліст, які сябры КХП-БНФ распаўсюджвалі ў дзяржаўных органах. Паводле Мін'юсту, ліст «скіраваны на фармаваньне няпрыязі, нянавісьці да расейскай нацыянальнасьці». Міністэрства юстыцыі прапануе спыніць распаўсюджваньне ліста і прызнаць яго распаўсюд памылковым дзеяньнем. У выпадку невыкананьня партыю ліквідуюць.

**10 сьнежня**

### Зарамбюка абвінавацілі

Мастоўскага дэмакратычнага актывіста **Алеся Зарамбюка** абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу і пагражаюць судом. Мітынгам пракуратура Мастоў лічыць сустрэчу **Аляксандра Мілінкевіча** з жыхарамі райцэнтру 4 лістапада.

**11 сьнежня**

### Арышты за прадпрымальніцкі мітынг

Намесьнік старшыні Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** асуджаны судом Цэнтральнага раёну Менску да 15 сутак адміністрацыйнага арышту за «нецэнзурную лаянку» (арт. 17.1 АК). Яго затрымалі 10 сьнежня, калі ён вярнуўся зь мітынгу прадпрымальнікаў.

Актывістаў кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» **Аляксандра Макаева** і **Аляксандра Цацуру** затрымалі перад пачаткам акцыі. Судзьдзя Маскоўскага раёну **Казак** прысудзіў Макаеву 7 сутак арышту нібыта за лаянку. За тое самае суд Цэнтральнага раёну адмераў Цацуру 10 сутак.

Вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу і шэсьця да плошчы Незалежнасьці суд Цэнтральнага раёну прызнаў аднаго з прадпрымальніцкіх лідэраў **Віктара Гарбачова**. Прысуд — 15 сутак арышту. **Віктара Калея** і **Віктара Крываля** ў тым жа судзе абвінавацілі ў актыўным удзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве. Прысуд — 10 і 15 сутак арышту адпаведна. Юнака **Барыса Гарэцкага** асудзілі на 7 сутак.

Актывістка АГП **Крысьціна Шацікава** аштрафаваная на 20 базавых велічыняў (700 тыс. бел. руб.).

**Вольгу Казуліну**, якая ў часе мітынгу прадпрымальнікаў прыехала на Кастрычніцкую плошчу з партрэтамі свайго бацькі, супрацоўнікі ДАІ аштрафавалі на 5 б.а. за тое, што яе пасажыры нібыта былі не прышпіленыя, а таксама за тое, што яна беспадстаўна сыгналіла.

17 сьнежня ў Гомелі адбудзецца суд на прадпрымальніцай **Ірынай Камінскай**, якую вінавацяць у распаўсюдзе ўлётак, прысьвечаных акцыі 10 сьнежня. Жанчыне пагражае арышт да 10 сутак.

12 сьнежня над А.Макаевым адбудзецца яшчэ адзін суд — аб 11-й гадзіне ў Ленінскім судзе. За некалькі дзён да мітынгу яго затрымалі ў офісе Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў і склалі пратакол за «дробнае хуліганства».

17 сьнежня ў Гомелі адбудзецца суд на прадпрымальніцай **Ірынай Камінскай**, якую вінавацяць у распаўсюдзе ўлётак, прысьвечаных акцыі 10 сьнежня. Жанчыне пагражае арышт да 10 сутак.

Прысуды ўдзельнікам мітынгу 10 сьнежня выносілі судзьдзі **Ясімовіч**, **Самасейка**, **Бычко**, **Казак**.




**Аўтуховіч Мікола**
Менск, вул. Кальварыйская 36, ВК-1, а/с 35, атрад 3

**Дашкевіч Зьміцер**
Шклоў, ВК №17
213004 Магілёўская вобласьць

**Казулін Аляксандар**
Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК-3, атрад 1
211300 Віцебская вобласьць

**Клімаў Андрэй Яўгенавіч**
г. Мазыр-11, ВК-20
247760 Гомельская вобл.

**Артур Фінькевіч**
г. Магілёў, 212011
вул Крупскай дом 99а
(сьледчая турма №4),
камэра 85

# Гандляры паказалі характар

У Менску несанкцыянаваныя мітынг і шэсьце ў цэнтры гораду сабралі каля тысячы дробных прадпрымальнікаў.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Мітынг прадпрымальнікаў 10 сьнежня на Кастрычніцкай плошчы ня быў санкцыяваны Менгарвыканкамам. Гарадзкія ўлады прадказальна адаслалі гандляроў на Бангалор. Але прадпрымальнікі яшчэ раней заявілі, што ў любым выпадку зьбяруцца каля Палацу рэспублікі.

Улады традыцыйна распачалі прэвэнтыўныя дзеяньні. Адзін з заяўнікаў акцыі, актывіст руху «За вольнае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» Аляксандар Таўстыка і прадпрымальнік Руслан Луцэнка былі асуджаныя на арышт за раздачу ўлётак з патрабаваньнем адмены ўказу №760. А аднаго зь лідэраў прадпрымальніцкага руху Аляксандра Макаева ды моладзевых актывістаў Алега Корбана і Міколу Сяргеенку яшчэ чакае суд. Міліцыянты сканфіскавалі ў арганізатараў рызограф і 5 тысячаў улётак з заклікамі прыйсьці на акцыю 10 сьнежня.

У панядзелак а 12-й па Кастрычніцкай плошчы пад гучную музыку, што неслася з рэпрадуктараў, разгульвалі некалькі дзясяткаў супрацоўнікаў у цывільным ды столькі ж журналістаў. Міліцыянтаў у цывільным акрамя падобных выразаў твараў яднала характэрная дэталь — большасьць зь іх была абутая ў аднолькавыя красоўкі. Людзі жартавалі: «Абулі «ціхароў» у наш канфіскат».

На падыходах да плошчы ДАІшнікі абшуквалі мікрааўтобусы і невялікія грузавікі. Праз паўгадзіны на плошчу пачалі падцягвацца прадпрымальнікі. На экране зьявіўся Аляксандар Лукашэнка ў чырвоным строі з ордэнам ад Чавэса. Заўсьміхаліся нават хмурыя дзецюкі ў чорных спартовых куртках. Насупраць экрану спынілася аўто, кіроўца пачаў сыгналіць, а з вокнаў зьявіліся партрэты Аляксандра Казуліна. Гэтак дачка палітвязьня Вольга нагадала пра свайго бацьку.

Пачалі разгортваць транспаранты. Праз гукаўзмацняльнік прысутных папярэдзілі пра магчымае ўжываньне фізычнай сілы і спэцсродкаў. На прыступках Палацу рэспублікі пачаўся імправізаваны мітынг. Выступілі заяўнікі акцыі, прадпрымальнікі з рэгіёнаў. Старшыня кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў заявіў, што лёс усіх дробных і сярэдніх гандляроў краіны вырашыцца ў наступным годзе. З ягоных словаў, пад пагрозай звальненьня па ўсёй Беларусі знаходзяцца некалькі соцень тысяч чалавек. Прагучала ідэя зьвярнуцца да старшыні Цэнтравыбаркаму з прапановай уладкаваць усіх звольненых сябрамі выбарчых камісіяў на выбарах у парлямэнт, а таксама назіральнікамі.

Аляксандар Таўстыка выказаў задавальненьне, што на мітынг сабралася столькі людзей: «Мы ўлічвалі сытуацыю і разьлічвалі на паўсотні».

Да мітынгоўцаў — навіна — выйшлі чыноўнікі. Начальніка ўпраўленьня прадпрымальніцтва камітэту эканомікі Менгарвыканкаму Аляксандра Каліноўскага асьвісталі і праводзілі з трыбуны пад крыкі «Ганьба». Кіраўнік дэпартамэнту па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Аляксандар Ліхачэўскі патлумачыў сэнс указу й паабяцаў разгледзець усе канструктыўныя прапановы.

Віктар Гарбачоў заявіў, што на ўзроўні дэпартамэнтаў іхнае пытаньне вырашыць немагчыма і заклікаў перадаць свае прапановы ў парлямэнт. Перад тым, як пакінуць Кастрычніцкую плошчу, удзельнікі акцыі заявілі, што калі іхны голас ня будзе пачуты, яны пачнуць забастоўку з 1 студзеня.

Па дарозе да Дому ўраду людзі скандавалі «Жыве Беларусь» і «Мы ня вошы». На гэты час колькасьць удзельнікаў дасягнула максымуму. Парлямэнтэраў, што несьлі зварот у парлямэнт, сустрэў старшыня камісіі ППНС па прамысловасьці, паліўна-энэргетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Анатоль Паўловіч. Ён прапанаваў прадпрымальнікам сустрэцца дзеля перамоваў 19 студзеня. Гандляры пагадзіліся і папрасілі ў прысутнасьці журналістаў гарантыі ў чыноўнікаў і міліцыі, што людзям дадуць разысьціся бяз арыштаў. Яшчэ адной просьбай было вызваліць чатырох затрыманых перад акцыяй і ў часе яе: Аляксандра Цацору, Аляксандра Макаева, Вольгу Казуліну й Барыса Гарэцкага. А дзе там. Калі людзі пачалі разыходзіцца, «ціхары» затрымалі Віктара Гарбачова, Віктара Крываля, Крысьціну Шацікаву ды Віктара Калея. Пры гэтым быў зьбіты Анатоль Лябедзька. У аўторак затрыманых судзілі за “нецэнзурную лаянку” і “арганізацыю шэсьця”. Пераважныя прысуды — арышты ад 10 да 15 сутак.

**Сямён Печанко**

# Дзякуй

**Уладзіславу М**. з Калінкавіцкага раёну.
**Мікалаю С.** з Ганцавіцкага раёну.
**Аляксандру К.** з Салігорску.
**М.С.** са Слуцку.
**Канстаціну П.,** Ганьне К. зь Віцебску.
**Антону Б., Галіне Ю.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**А.І.** зь Берасьця.
**Раісе М., Генадзю Ш., Івану К., А.Р., Е.Л.. Зінаідзе Б., Алесю Ц., Мікалаю Б., Тамары Л.** зь Менску.

з ь б я р ы « К н і г а р н ю « Н а ш а Н і в а »




Дзеяньне новага раману Наталкі Бабінай адбываецца ў часе прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году. Але твор ня толькі палітычны — ён лучыць у сабе рысы прыгодніцкага, дэтэктыўнага, жаночага і гістарычнага раману. А яшчэ гэта раман пра Берасьце — якое было, якое ёсьць і якое будзе. Гэта захапляльная гісторыя каханьня, сьмерці, цудаў і ўратаваньня.

Шукайце ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў.

NB: Раман мае неўзабаве выйсьці папольску і ўкраінску. Ён стане першым беларускім творам, які выйдзе ў Польшчы як камэрцыйнае выданьне пасьля 1991 году.

**Рыбін горад: Раман / Наталка Бабіна. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 312 с. («Кнігарня «Наша Ніва»)**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Камуніст супраць ЖРЭУ

**Сябра ПКБ у Баранавічах выйграў суд у ЖРЭУ, прымусіўшы тое прыбіраць яго пад’езд.**

Баранавіцкі сябра Партыі камуністаў беларускай Віктар Цяпін, разам зь яшчэ двума жыхарамі свайго дому па вуліцы Камсамольскай № 9, яшчэ ў верасьні напісаў скаргу ў баранавіцкае “Жыльлёвае рамонтна-эксплуатацыйнае ўпраўленьне”. У ёй было зазначана, што, згодна з Інструкцыяй пра парадак аплаты насельніцтвам жыльлёва-камунальных паслугаў, ЖРЭУ мусіць прыбіраць лесьвічныя клеткі. Але ў іх доме такой паслугі камунальшчыкі ніколі не выконвалі.

Напачатку на іх зварот ЖРЭУ ніяк не адрэагаваў. Тады жыхары дому па Камсамольскай, 9 зьвярнуліся ў баранавіцкую пракуратуру. Там высьветлілася, што камунальшчыкі даслалі ў тэрмін адказ простымі лістамі кожнаму, хто падпісаўся пад скаргай, але тыя чароўным чынам не дайшлі да адрасатаў. Новыя адказы былі дасланыя заказнымі лістамі.

У іх паведамлялася, што жыхары сваімі аплатамі кампэнсуюць камунальныя выдаткі толькі на 41%. Рэшту мусіць кампэнсаваць гарадзкі бюджэт. Але горад выплочвае таксама толькі прыкладна 41% ад патрэбнага. Бюджэт гораду фармуецца ў Берасьці, таму больш грошай мясцовыя ўлады выдаткаваць ня могуць. Вынікае, што ЖРЭУ ня мае магчымасьці прыбіраць пад’езды празь недахоп сродкаў.

Цяпін, разам зь іншымі жыхарамі дому, не пагадзіўся з такім адказам і накіраваў скаргу ў суд. Маўляў, іх фінансавыя мажлівасьці камунальшчыкі ня ўлічваюць і за неаплату ці недаплату адразу ж караюць пеняю. Чаму ж тады жыхары мусяць лічыцца з праблемамі ЖРЭУ?

25 кастрычніка суд прызнаў праўду за жыхарамі дому па Камсамольскай, 9 і пастанавіў прыбіраць пад’езды істцоў. Акрамя таго, ЖРЭУ мусіць выплаціць па 20000 рублёў кампэнсацыі маральнай шкоды кожнаму з істцоў.

Але цяпер у Баранавічах прыбіраюць толькі пад’езды згаданай камяніцы па вуліцы Камсамольскай. Віктар Цяпін зьбіраецца зьвяртацца ў пракуратуру, каб тая пракантралявала выкананьне камунальшчыкамі закону па ўсім горадзе.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Сьвятлаадбіваюцца ўсе!

**Вось некалькі выпадкаў, зьвязаных з флікерамі:**

**Даша К.:** Ішлі мы зь сябрамі на дыскатэку ў ДК. Ужо цёмна так было, і ўсе былі бяз флікераў. Ну, і каб нас не штафанулі за гэта, вырашылі скарыстацца падручнымі сродкамі — мабільнікамі, уключылі падсьвятленьне. Першы ішоў наш сябра, за ім я са сваім хлопцам і апошняй, сьпінай да нас і тварам да шашы, ішла мая сяброўка. Такім агністым вусенем і ідзем да дыскатэкі. Насустрач людзі з флікерамі, сьмяюцца, машыны бібікаюць. Адна спыняецца: «А гэта што?» — «А гэта адно вялікае падабенства флікера!» Дайшлі да Біль-бару, ля якога стаяла нашая міліцыя. І кажуць нам: «Гэта вы каб не набываць флікеры?» Таксама пасьмяяліся, пахвалілі нас. Цяпер хаджу з флікерам.

**Саша С.:** Тыдзень не была дома. Заходжу ў хату, а маці так дэманстратыўна дае мне флікер і кажа: «На, будзеш сьвятлаадбівацца. Хадзі як чалавек, а то яшчэ задушыць хто». Увечары тэлефаную сябрам, пытаю, чаму не заходзяць. А яны баяцца, бо ля маёй хаты штовечар стаіць пост ДАІ і ўсіх, хто бяз флікераў, штрафуе. Двух суседзяў аштрафавалі. Адзін ішоў па гарэлку, другі па мінэралку. Сама вось хутка буду хадзіць у прыбіральню з флікерам. Адна мая знаёмая пайшла ўвечары ў краму набыць што-небудзь смачнае да вячэры. Усе грошы аддала. На штраф за флікер. Да крамы ж мэтраў 100 было. Вось і наелася.

**Ганна В., Вялейка**

## 17 міжнародны конкурс дзіцячых малюнкаў на тэму захаваньня прыроднага навакольля

**У лістападзе 2007 — студзені 2008 г. Праграма ААН па праблемах навакольля (ЮНЕП) праводзіць 17-ы конкурс дзіцячых малюнкаў на тэму захаваньня прыроднага навакольля — «Зьмены клімату: нашыя дзеяньні, скіраваныя на зьмяншэньне нэгатыўных уплываў».**

Малюнкі мусяць адлюстроўваць канкрэтныя дзеяньні, напрыклад: выкарыстаньне аднаўляльных крыніцаў энэргіі, выкарыстаньне энэргазьберагальных прыладаў, сумеснае выкарыстаньне аўтамабіляў, падтрымка грамадзкага транспарту, пасадка дрэваў і г. д. Правілы і ўмовы конкурсу: фармат малюнкаў — А3 альбо А4; на зваротным баку малюнка — поўнае імя, дата, месяц, год нараджэньня, поўны адрас, адрас электроннай пошты, тэлефон; стыль і тэхніка выкананьня працаў вольныя; працы, якія ўдзельнічалі ў іншых конкурсах, не прымаюцца; працы не павінныя ўтрымліваць ніякіх словаў і апісаньняў; прымаюцца толькі арыгіналы працаў. Працы мусяць быць дасланыя ў рэгіянальны офіс ЮНЕП у Жэнэве. Тэрмін атрыманьня працаў — да 15 студзеня 2008. Падрабязная інфармацыя — на http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki/

# Беларусь tomorrow

## Напішы, што думаеш, і зьезьдзі ў Эўропу!

Калі табе да 26 гадоў і ты не абыякавы да будучыні Беларусі, то напішы эсэ і адпраў на электронны адрас belradio@mail.ru

**Што пісаць?**

Абяры адну з шасьці тэмаў або можаш пісаць па кожнай:

1. Нацыянальная ідэя
2. Высокія тэхналёгіі
3. Адукацыя
4. Культура
5. Зьнешняя палітыка
6. Палітычны лад краіны

**Колькі часу на роздум?**

На напісаньне эсэ даецца час да 20 сьнежня. Прадугледжаны памер працы — ня больш за 2000 знакаў. Тэматыка у межах буйной тэмы (напрыклад, адукацыя) можа быць якой заўгодна, ад пляну для канкрэтнага ўніверу да глябальнай ацэнкі сыстэмы адукацыі.

**А судзьдзі хто?**

У якасьці судзьдзяў выступяць вядомыя экспэрты ў розных галінах (па адным на кожную тэму).

У іх склад увайшлі:

**Сяргей Панькоўскі** — кандыдат філязофскіх навук, палітоляг, кіраўнік праекту «Наше мнение»

**Раман Якаўлеўскі** — аглядальнік міжнароднага інтэрнэт-парталу «Wider Europe»

**Уладзімер Мацкевіч** — філёзаф і палітоляг

**Юры Зісер** — старшыня дырэктараў парталу tut.by

**Пётар Марцаў** — стваральнік газэты БДГ, журналіст, бізнэсмэн і аналітык

**Максім Жбанкоў** — кінакрытык, журналіст, выкладчык «Беларускага калегіюму»

**Як перамагчы і куды едзем?**

У выніку экспэрты вызначаюць 6 пераможцаў: па адным на кожную тэму. У дадатак, паводле вынікаў галасаваньняў вызначаюцца яшчэ 2, за працы якіх было аддана больш за ўсё галасоў. Гэтыя 8 асобаў паедуць ў 4-дзённае падарожжа па Польшчы, дзе сустрэнуцца з палітыкамі, эканамістамі, даведаюцца болей пра польскія рэформы.

І памятайце — чым раней прышлеце працу, тым большая колькасьць чалавек пасьпее за яе прагаласаваць.

Кожны тыдзень у нядзелю на хвалях «Эўрарадыё» і на сайце www.belradio.fm новы праект «Беларусь tomorrow» — цыкль дыскусіяў пра будучыню Беларусі.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Утопія ў цэгле і тынку

Артур Клінаў адказвае Сяргею Харэўскаму і Захару Шыбеку ("НН", №44)

Дыскусія, якая рана ці позна павінная была паўстаць вакол Гораду Сонца ды нарэшце распачалася ў пазамінулым нумары «Нашай Нівы» тэкстамі Сяргея Харэўскага й Захара Шыбекі, зводзіцца да адной падставовай праблемы: якім чынам адаптаваць Горад Сонца ў нацыянальны кантэкст? Пытаньне, канечне, можна паставіць інакш: ці трэба ўвогуле адаптаваць Горад Сонца ў нацыянальны кантэкст?

Аднак пытаньне «Якім чынам?» відавочна мае перавагу перад «Ці трэба?», хаця б зыходзячы з таго факту, што, хацелі б мы таго ці не, Горад Сонца ёсьць аб'ектыўнай дадзенасьцю, зь якой, у якой ці побач зь якой нам давядзецца жыць і надалей. Прымем мы яго ці праігнаруем, але ён застанецца падставовым матывам у фармаваньні вобразу Менску.

Перш за ўсё, каб зьняць абвінавачваньні тых, каму ідэя Гораду Сонца не даспадобы, у тым, што ён, быццам, нясе пагрозу старадаўняму Менску, трэба акрэсьліць ягоныя рэальныя межы. Бо, натуральна, да Гораду Сонца мае дачыненьне ня ўсё набудаванае тут за савецкімі часамі. Бэтонныя спаруды 1970-х, хрушчоўкі ды шмат што яшчэ зьяўляюцца артэфактамі ўжо іншага гораду.

Горад Сонца ёсьць горадам у горадзе ды мае вельмі канкрэтныя прасторавыя абрысы й час зьяўленьня ягоных ансамбляў. З захаду на ўсход ён мае даўжыню прыблізна сем кілямэтраў, пачынаецца плошчаю Леніна ды цягнецца да ўсходняй мяжы парку Чалюскінцаў. Яго шырыня вагаецца ад некалькіх кварталаў да некалькіх кілямэтраў. У пэўных месцах яна сягае ў глыбіню Менску дастаткова далёка, як у раёне жылых кварталаў трактарнага заводу (т.зв. Малы Горад Сонца), але часам абрываецца ўжо за некалькі сотняў мэтраў, напрыклад, як кварталы Палацу Дзяржбясьпекі, што мяжуюць з вуліцай Інтэрнацыянальнай, левы бок якой ужо не належыць Гораду Сонца.

Аднак найважнейшым для нас зьяўляецца тое, што Горад Сонца прайшоў побач з найбольш каштоўнай, найбольш старадаўняй часткай Менску, практычна не закрануўшы яе. Тое барбарства, якое пракацілася па Нямізе ў 1970-я гады, ужо ня мела ніякага дачыненьня да Гораду Сонца. Больш за тое, калі ў будучыні паўстане праект аднаўленьня Нямігі ды іншых кварталаў, са зносам некалькіх бэтонных пачвараў, гэта ніяк не паўплывае на цела Жоўтага Гораду (іншае вызначэньне Гораду Сонца). Наадварот, такі праект толькі б узмацніў канцэптуальную повязь гэтых двух гарадоў — Нямігі ды Жоўтага Гораду. Разам яны зьвязаныя ў адну міталягічную канструкцыю. Бо ён — *Горад СОНца*, а яна — *БясСОНьне* (Няміга ў перакладзе з старалітоўскай азначае *бяссоньне,* альбо *тая, якая ня сьпіць.*). Яна — *бяссонная Ноч*, а ён — *сонечны Дзень*. Яна — *падземная рака, бяссоньня крывавыя берагі, Стыкс ды Арэхонт, Тартар беларускага лёсу*, а Ён — *сонечны Горад Мрояў, Горад — прадчуваньне выраю, які так і не адбыўся.*

Горад Сонца ўвасобіўся ў Менску невыпадкова. Ён зьвязаны зь ім усёй містыкай пяці стагодзьдзяў перадгісторыі свайго зьяўленьня менавіта тут. Калі б ён меў шанец паўстаць у Саратаве ці Тамбове, то ён паўстаў бы там. Перш за ўсё, ён паўстаў бы ў Маскве. Аднак усе высілкі збудаваць яго ў Саратаве, Тамбове, Маскве, а таксама Кіеве, Харкаве, Валгаградзе, Баку ды іншых гарадах Саюзу плёну не далі. Там зьявіліся толькі асобныя фрагмэнты, будынкі, кварталы, якія патанулі ў эклектыцы папярэдняй забудовы гэтых гарадоў. Горад Сонца як цэльнае цела, як цэльны горад увасобіўся толькі тут і нідзе болей у іншым месцы. Таму заявы, што такога дабра поўна па ўсёй тэрыторыі былога Саюзу, гучаць, мякка кажучы, не карэктна. Тым больш некарэктна валіць да адной кучы Горад Сонца, Курапаты, габрэйскае гета ды зьверствы сталінскага рэжыму. Горад Сонца ня ёсьць помнікам сталінізму. Гэта помнік чалавечым мроям, спробам ажыцьцявіць Утопію — збудаваць вырай на зямлі, які ніколі ня прыйдзе.

> Цэнтар Менску — гэта помнік чалавечым мроям, спробам ажыцьцявіць Утопію — збудаваць вырай на зямлі.

Горад Сонца — унікальны горадабудаўнічы ансамбль, аналягаў якому няма на абшарах Эўропы. І менавіта беларусы сёньня зьяўляюцца спадкаемцамі гэтага дзіўнага помніка. Канечне, яго мала што зьвязвае зь мілай сэрцу сьвядомага беларуса сармацкай культурай ды традыцыямі Вялікага Княства Літоўскага. Аднак ніхто й не прапануе зьдзейсьніць зь яго адзін з базавых нацыянальных мітаў ды ўсадзіць гіпсавы бюст Карла Маркса на каня побач зь вершнікам на Пагоні. Але мы можам зрабіць зь яго адзін з пазнавальных у сьвеце беларускіх брэндаў, такіх як *Белавеская пушча, трактар «Беларусь», партызан, дранікі, Віцебская школа*, ды пачаць атрымліваць ад яго як матэрыяльныя, гэтак і маральныя дывідэнды.

Калі з матэрыяльнымі дывідэндамі ўсё больш-менш зразумела: у пэрспэктыве Горад Сонца — у выпадку, калі мы не праігнаруем, а ператворым яго ў новы турыстычны брэнд, — здольны прыцягваць мільёны турыстаў з усяго сьвету, — то маральныя аспэкты патрабуюць пэўных заўвагаў. Сёньня Беларусь — гэта краіна страчанай спадчыны. Калі наш чалавек прыяжджае ў Парыж, Рым, Флярэнцыю ці Прагу, то ў меншай ці большай ступені, але мае комплекс перад веліччу гэтых месцаў, бо за плячыма ня мае гораду, роўнага ім. Падабаецца нам гэта ці не, але ў будучым толькі адзіны горад у Беларусі па сваёй мітапаэтычнай і эстэтычнай канструкцыі зможа скласьці ім канкурэнцыю — Менск з Горадам Сонца (і, дай бог, адроджанай Нямігай).

Што ж тычыцца нацыянальнага кантэксту, то Горад Сонца насамрэч ужо даўно прысутнічае ў ім. Магчыма, гэты аргумэнт прагучыць не зусім навукова, але калі Горад, асьвечаны сакрумам успамінаў дзяцінства хаця б аднаго пакаленьня менчукоў, якія нарадзіліся ў ім, то ён ужо ня можа быць не ў кантэксьце. А цяпер мы маем не адно пакаленьне, але ўжо прыходзіць трэцяя генэрацыя беларусаў, кожны зь якой зможа сказаць: «Я нарадзіўся ў Горадзе Сонца!»

# Федзя

Вакаліста «Голай манашкі» Хведара Жывалеўскага можна назваць сапраўдным рокерам у тым самым аўтэнтычным разуменьні – «сэкс, драгз і рок-н-рол». Яго злавілі і асудзілі паводле другой часткі 205 артыкулу («Крадзеж») ды выправілі на хімію. Было гэта ўвосень 2006, але Хведзя вырашыў выпрабаваць лёс лішні раз ды проста зьбег адтуль на Новы Год. І яго чакала куды большае пакараньне — 1,5 гады агульнага рэжыму плюс 73 артыкул (у дадатак). А сёлета на яго завялі яшчэ адну справу — за падробку дакумэнтаў, але прысуд пакінулі ранейшым. У падрабязнасьці Хведзя ня надта хоча ўлазіць, кажа, што злачынствы гэтыя сапраўды зрабіў. «Іншае пытаньне – чаму я так лёгка трапіў у рукі правасудзьдзя... Прызнаюся, мінулы год быў вельмі цяжкім, асабліва Вясна-2006. Усё гэта, плюс некаторыя асабістыя абставіны, вельмі мяне ўсхвалявала і ўзрушыла псыхіку. Праз немагчымасьць наладзіць кантакт з больш-менш адэкватнымі людзьмі я варыўся ў спэцыфічным асяродзьдзі...», — тлумачыць ён цяпер. Крыху больш за тыдзень таму ён прайшоў псыхіятрычную экспэртызу ў Рэспубліканскім турэмным шпіталі — яму далі даведку пра зьніжаную псыхічную адэкватнасьць.



«Магчыма, мой лад жыцьця ня вельмі вам падабаецца, аднак гэта тая сытуацыя, дзе вы можаце пазнаёміцца з «андэграўндам» у літаральным сэнсе. Многія свае крокі магу патлумачыць як экспэрымэнты», — распавядае Фёдар. Ён бачыць у сваіх прыгодах карыснае і да сёньня — беларускамоўную музыку сталі слухаць «пацаны з раёну». На ягоную думку, апазыцыянэры, да якіх ён сябе не далучае, ня хочуць разумець сучасную разгубленую моладзь. «Іх жыцьцёвыя праблемы, якія запаланяюць літаральна ўсё, расцэньваюцца як дробныя справы была. Мне крыўдна, і ў той жа час я разумею, што нічога не магу зьмяніць».

Хведзя ў турме перажывае моцную дэпрэсію, якая можа перарасьці ў апатыю: «На зоне большасьць зьвяртаецца да хамскай манеры паводзінаў, каб абараняцца ад таго ж самага хамства. Зьбіраць у адным месцы такую колькасьць злачынцаў і няўгодных — ня надта разумны ход, гэта памылка ўсяго чалавецтва, а не канкрэтнай краіны». Тут, у турме, хлопец працягвае займацца творчасьцю — піша песьні і апавяданьні. Сустрэў аднадумцаў, у калёніі ёсьць нават рок-каманда, так што лідэр «Голай манашкі» мяркуе нават паразьмяцца перад выхадам на волю. А сядзець яму засталося яшчэ пяць месяцаў.

Ужо падчас Федзевай адседкі лэйбл «БМА-груп» выдаў новы дыск ягонага гурту «Неба BLAкітнае», ягоныя песьні таксама трапілі на складанку, прысьвечаную Ларысе Геніюш, і ў праект «Чарнобыльскі вецер». «Як бачыце, мая адседка не праходзіць для праекту як «мёртвы сэзон», — падсумоўвае лідэр «Голай манашкі».

**Сяргей Будкін**

**Цалкам ліст Фёдара можна пачытаць на сайце «Тузін Гітоў»**
**Афіцыйны сайт гурту «Голая манашка» — http://goman.iatp.by**

## СЬЦІСЛА

### «Палац» у паўфінале адбору «Эўрабачаньне»

Пра гэта паведаміў на прэсавай канфэрэнцыі кіраўнік праекту «Эўрафэст» Аляксандар Ціхановіч. Усяго вызначаныя 15 паўфіналістаў. Паўфінал пройдзе 21 сьнежня, тэлегледачы і журы вызначаць галасаваньнем два—тры фіналісты. Трансьляцыю глядзіце на Першым канале ТВ.

### Выканаўцы фальклёру прымусілі сьцішыць дыханьне

Зь вялікім посьпехам прайшоў канцэрт вядомых фолк-калектываў у малой залі КЗ «Менск». Розныя па манеры выкананьня, розныя па энэргетычным пасыле, усе выступы былі сустрэтыя публікай вельмі прыхільна. Філязофская, насычаная сымбалямі праграма «Госьціцы» зьмянілася магутнымі аўтэнтычнымі сьпевамі гурту Guda, потым абаяльны Уладзімір Бербераў вывеў на сцэну сваіх «Ліцьвінаў». Кожная праграма ўразіла сапраўднай прыгажосьцю артыстаў, іх уменьнем і прыслухацца да аўтэнтыкі, і сур’ёзна асэнсаваць яе пасучаснаму — і таму кранала. Чароўная цішыня ў залі ў часе выступаў зьмянялася захопленымі аплядысмэнтамі пасьля іх заканчэньня.

### Мітрапаліт Філарэт узнагародзіў Янку Запрудніка

Вядомы беларускі эмігрант Янка Запруднік ушанаваны мэдалём Сьв. Кірылы Тураўскага. Такім чынам яму аддзячылі за шчодрыя ахвяраваньні на будоўлю царквы Сьвятой Эўфрасіньні ў Івянцы.

### Памёр Валянцін Блакіт

Пасьля цяжкой і працяглай хваробы ў бараўлянскай больніцы пайшоў з жыцьця Валянцін Блакіт (сапраўднае імя Валянцін Болтач). Ён доўгі час быў галоўным рэдактарам часопісу «Вожык». Родам ён быў з Вострава (Шчучынскі раён).

### Замяталінскі крэатыў

Каб падтрымаць беларускае кіно, трэба ўвесьці падатак на галівудзкае. Такую прапанову агучыў дырэктар «Беларусьфільму» палкоўнік Уладзімер Замяталін. Амэрыканскія фільмы складаюць 30% рэпэртуару менскіх кіно, але даюць 70% усіх збораў.

**НБ; АГ; Буг**

### Шчасьлівая лічба

Лічба 13 сталася шчасьліваю для кінакарціны «Франц і Паліна», створанай паводле аповесьці Алеся Адамовіча «Нямко», якая расказвае пра гісторыю каханьня беларускай дзяўчыны і маладога эсэсаўца.
На сёлетнім, 13-м Жэнэўскім кінафэстывалі фільм заняў 2-е месца. У зьнятай маладым рэжысэрам Міхаілам Сегалам карціне гучаць беларуская, нямецкая і расейская мовы.
Эўрапейскі посьпех фільму можна лічыць своеасаблівым падарункам нашай культурніцкай супольнасьці да 80-гадовага юбілею знакамітага пісьменьніка, кінэматаграфіста і грамадзкага дзеяча, які адзначаўся зусім нядаўна.

**УС**

## Сьвет убачылі «Жодзінцы»

**Жодзінцы.** Жывапіс. Графіка. Мастацкае слова. — Радыёла-плюс: Менск. 66 ст. Наклад 150 ас.

Выйшла мастацка-літаратурнае выданьне, пад адной вокладкай якога зьмясьціліся й невялічкі альбом мастакоўскіх твораў і колькі літаратурных тэкстаў, створаных тымі, чый лёс і творчасьць скрыжаваліся ў Жодзіне. У яго аснову была пакладзеная канцэпцыя аднайменнае выставы-праекту, ініцыятарамі якое выступілі пісьменьнік Уладзімір Сіўчыкаў і мастак Аляксей Марачкін.

Гісторыю Жодзіна яны лічаць не ад стварэньня «БелАЗу, але ад Багуслава Радзівіла, 360 гадоў таму гэтыя мясьціны называліся Багуслава Поле.

А цяперашнія «жодзінцы» — гэта тыя, хто пачынаў сваю дзейнасьць у Жодзіна. Гэта славутыя цяпер мастакі й літаратары: Валеры Славук, Уладзімер Гладкевіч, Ігар Марачкін, Алесь Аркуш, Ўладзімер Сіўчыкаў, браты Андруковічы ды іншыя.

Пэўна ж, трымаючы ў руках гэтае выданьне, міжволі згадаеш дзясяткі іншых беларускіх гарадоў, што яшчэ не займелі такога. Але менавіта з гэтае стыхіі, з жывога цела вялізарных абшараў нашае краіны й растуць тыя краскі, што ўплятаюцца ў шыкоўныя шаты нашае культуры. Рэальнае, непадуладнае культуры.

**СХ**

# Хобіт стаў беларусам



Расейскаму (скажу вам, ня горшаму) перакладчыку «Хобіта» не пашэнціла патрапіць у рытміку арыгіналу. Але ж беларускі пераклад яшчэ й больш дакладны — расейцы, якія перакладалі «Хобіта» і «Ўладара пярсьцёнкаў», ня вельмі клапаціліся пра падабенства да арыгіналу. У Мураўёва, напрыклад, можна знайсьці цэлыя кавалкі тэксту, якія ён проста прыдумаў. У Курчанковай ды Магілёўцава ніякіх такіх хібаў няма.



Цудоўная мова. Цудоўныя знаходкі — *dragon Smaug* стаў па-беларуску *цмок Драк*. Асабліва ўражаны перакладам вершаў. Параўнайце:

Chip the glasses and crack the plates!
Blunt the knives and bend the forks!
…
That's what Bilbo Baggins hates!

Кубак — трэсь, талерка — бразь!
Гні відэлец, нож папсуй!
…
Стогне Більба «вох» ды «ах».

Але ж галоўнае ня трапнасьць. Галоўнае — атмасфэра кнігі. Хобіт, які любіць добра паесьці, ня сунецца ў розныя *прыгоды* ды адпускае кепікі наконт розных вар'ятаў, якія сноўдаюцца туды-сюды замест таго, каб сядзець сабе дома, і Хобіт, які, натрываўшы колькі часу, паўстае супраць оркаў-інтэрвэнтаў, як быццам бы маляваліся зь беларуса, які паўстае перад намі ў «Зямлі пад белымі крыламі» Караткевіча. І перакладчыкі вельмі ўдала перадалі гэтую атмасфэру. А мо гэта проста мова наша такая. Але ж мова гэта ці яшчэ якая праява, а людзі гэтыя зрабілі велізарную і найкарысьнейшую справу. Бо калі нацыя мае свой, ды яшчэ *такі,* пераклад Толкіна, то яна, відавочна, існуе, што б там ні казалі пра гэта беларускія й ня толькі інтэлектуалы. Ну, і чакаем, вядома ж, «Уладара пярсьцёнкаў» ды «Сільмарылёну».

**Аляксандар Чубрык**

## НОВЫЯ КНІГІ

**Білорусько-український словник** / Півторак Г.П., Скопненко О.І.; – Кіеў: Довіра, 2006. – 723 с.

**Вугорска-беларускі слоўнік** / Пад рэд. Атылы Голаша і Ларысы Станкевіч. Нірэдзьгаза 2007. – 280 с. // Magyar-fehйrorosz szytбr / Szerk. Hollys Attila йs Larisza Sztankevics. Nyнregyhбza 2007. – 280 p._**Magyar - feherorosz szotar** = Vugorska-bielaruski slounik / szerk. Hollos Attila es Larisza Sztankevics. – Nyiregyhaza : NYF Ukran es Ruszin Filologiai Tanszeke, 2007. – 280 p.

# Ня хлебам адзіным…

Кніга пра смачную і здаровую ежу*. Піша **Віталь Тарас**.

У наш час пісаць рэцэнзіі на кніжкі зрабілася заняткам непапулярным. Вельмі многія лічыць больш карысным і прыемным для сябе заняткам выдаваць уласныя творы заміж таго, каб чытаць чужыя. Як у савецкім анэкдоце: "чукча не чытацель — чукча пісацель". Сёньня, узброіўшыся кампутарам ды інтэрнэтам, можна заўсёды выказаць сваё меркаваньне ці ацэнку ў якімсьці ЖЖ. Пры гэтым "рэцэнзэнт" застаецца ананімным і не рызыкуе атрымаць пры выпадковай сустрэчы з "рэцэнзаваным" па галаве за адвязаную крытыку ці простую зьнявагу.
Ня толькі так званая "камплімэнтарная крытыка" — увогуле крытыка як жанр паступова адыходзіць у нябыт.
Але што рабіць, калі кніга, якую давялося прачытаць, выклікае забытае пачуцьцё радасьці (з гадамі гэтае пачуцьцё ўзьнікае ўсё радзей) і атавістычнае жаданьне падзяліцца гэтым пачуцьцём і думкамі зь як мага большай колькасьцю людзей? Мо гэта выглядае на эгаізм, але рызыкну ў дадзеным выпадку так і зрабіць.

### Настальгія наадварот

Цікава, ці ёсьць панятак "настальгія" наадварот? Я маю на ўвазе настальгію не па родных мясьцінах, але па чужых краінах, у якіх давялося быць, па людзях, зь якімі давялося там пазнаёміцца і зь якімі амаль напэўна ніколі ўжо не пабачысься. Альбо настальгію ў гастранамічным сэнсе — не па "Московской особой", каўбасе "Любительская" і вінэгрэце, а па сапраўднай піцы "Маргарыта", пасьце "Мафіёза" і равіёлях са шпінатам.
Пра тое, што такое сапраўдная піца і як яна гатуецца — дакладней, на тваіх вачах ствараецца ў руках майстра — упершыню давялося ўведаць падчас жыцьця ў Празе. Тамсама даведаўся, што італьянская паста (пасташута) ня мае ніякага дачыненьня да савецкае макароны. І што яна мае тысячы відаў і найменьняў.
Канечне, у Празе можна атрымаць задавальненьне і ад чэскай кухні. Чым кепска зьесьці аднойчы "печэна колана" (вэнджаную рульку) пад куфаль-другі піва "Старапрамэн" і закусіць сырам "Гэрмэлін"? Але ж кожны дзень так ня будзеш харчавацца, бо праз месяц — другі вынікі будуць адчувацца па лішніх кіляграмах вагі ды болю ў вантробах.
Італьянская ежа разьлічаная ня толькі на вялікіх гурманаў, але й проста больш карысная для здароўя. Так, паста ня толькі ўтрымлівае эндарфіны (гармоны шчасьця), але ў спалучэньні зь зелянінай, рознага роду соўсамі і сухім вінoм вельмі хутка засвойваецца арганізмам, а не асядае ў ім у выглядзе дадатковых грамаў тлушчу.
Так што, як ні дзіўна, сярод замежных турыстаў у Празе найбольшай



папулярнасьцю карыстаюцца ня чэскія рэстарацыі і кавярні, а італьянскія. Газэта Prague Post пісала, што якасьць італьянскай ежы і ўзровень майстэрства яе прыгатаваньня ў сталіцы Чэхіі пераўзышлі якасьць ежы, якой можна пачаставацца ў буйных гарадах Італіі. Можна было б падумаць, што гэта ўсяго толькі рэкляма для турыстаў. Але мне самому не аднойчы даводзілася стаяць у чарзе, каб пасьнедаць у сьціплай на выгляд кавярні з італьянскай кухняй. І гэта ў цэнтры Прагі, дзе кавярняў і рэстарацыяў (чэскіх, амэрыканскіх, француcкіх, азіяцкіх) — безьліч.
Праўда, кухарамі ў італьянскіх рэстарацыях тут вельмі часта працуюць выхадцы з былой Югаславіі. Але ж гатуюць яны менавіта італьянскія стравы.
А вось падчас кароткай турыстычнай паездкі ў Італію нічога спэцыфічна італьянскага пакаштаваць так і не ўдалося — у найлепшым выпадку, вэрмішэль з катлетамі альбо амэрыканскі фастфуд. (Прадбачлівыя чэхі захапілі з сабой у вандраваньне батоны цьвёрдай каўбасы і ёю ўвесь час харчаваліся — дакладна так, як гэта рабілі некалі савецкія турысты.)

### Піца супраць пасты

Прачытаць кнігу, прысьвечаную італьянскай кухні, было для мяне як бы вяртаньнем у паўзабыты ўжо, але ўсё ж такі рэальны сьвет, поўны радасных адкрыцьцяў і сонца. Але адразу папярэджу гурманаў. Аўтарка кнігі Алена Касьцюковіч напісала не кулінарную кнігу, ня зборнік рэцэптаў. Гэта зь першай старонкі і да апошняй — менавіта кніга. Дасьледваньне, напісанае жывой мовай. Калі дасьледчыца апісвае нейкую страву — п'емонцкую паленту, лямбардыйскае рызота, тасканскую фарынату — яна зьвяртаецца да гісторыі П'емонту, Лямбардыі, Балёньі, традыцыяў і звычаяў тамтэйшага насельніцтва, у тым ліку ў харчаваньні і спосабах прыгатаваньня ежы. Адначасова яна дае масу цікавай інфармацыі, зьвязанай з геаграфіяй, эканомікай, этнаграфіяй, палітыкай і іншымі галінамі жыцьця чалавецтва. І пры гэтым кніга не ператвараецца ў набор фактаў і лічбаў — яна застаецца цэласнай і празрыстай.
Ніхто, бадай, лепей ня скажа пра Алену Касьцюковіч за аўтара прадмовы да яе кнігі — італьянскага пісьменьніка Умбэрта Эка. У СССР і ў новых незалежных краінах ягоныя знакамітыя ва ўсім сьвеце "Імя ружы", "Ківач Фуко", "Баўдаліна" ведаюць дзякуючы перакладам Касьцюковіч на расейскую мову. Яна ўжо шмат гадоў працуе разам з Умбэрта Эка ў якасьці літаратурнай памочніцы. Вось што піша пра яе славуты пісьменьнік:
"…Алена, якая ў дадатак выяўляе сябе выключна глыбокім знаўцам італьянскай кухні ва ўсіх яе складаных нюансах і патаемных глыбінях, вядзе нас за руку (можна сказаць, заваблівае на пах, зачароўвае спакушальнымі смакамі), і мы зьдзяйсьнем разам зь ёй кулінарнае падарожжа ня толькі дзеля таго, каб даведацца ўсё пра ежу, але ў асноўным дзеля таго, каб уведаць усё пра Італію. Італію, якую Алена

* Елена Костюкович. «Еда. Итальянское счастье». — Москва, 2007

Касьцюковіч вывучае ўсё сваё жыцьцё”. У кнізе “Ежа. Італьянскае шчасьце” на кожным кроку цябе чакаюць адкрыцьці. Паста і піца, да прыкладу, зусім ня роўназначныя паводле важнасьці для італьянскай кухні і традыцыяў паняткі. Піца — страва, хутчэй, характэрная для ЗША. Як жартуюць самі італьянцы, на якіх спасылаецца аўтарка, паста — для абеду за сямейным сталом, піца — для вячэры з каханкай. Тлумачыцца гэта проста. Пасту лёгка прыгатаваць дома. Каб прыгатаваць піцу, трэба печка адмысловай канструкцыі, якая распальваецца дровамі (!) да 400 градусаў Цэльсія. А галоўнае — патрэбныя сапраўдныя майстры кухарскай справы, віртуозы сваёй справы. Сам працэс яе прыгатаваньня на вачах наведніка ўваходзіць, можна сказаць, у абавязковы рытуал. Так што той прадукт, які можна пакаштаваць у менскіх рэстарацыях наўрад ці можна назваць піцай у поўным сэнсе гэтага слова.

### “Хто зашмат есьць, той рабуе Радзіму”

Увогуле, савецкі панятак “абшчапіт”, які, на жаль, глыбока ўкараніўся ў гарадзкім жыцьці беларусаў, абсалютна чужы для італьянцаў. Прывяду некалькі фрагмэнтаў з разьдзелу пад назвай “Таталітарызм” у сваім вольным перакладзе.
“Таталітарнымі рэжымамі ствараюцца залітаваныя (ухваленыя цэнзурай — **В.Т.**) кухаварскія кнігі, прызначаныя не гаспадыням, а абшчапіту. Інгрыдыенты ў іх дазаваліся вёдрамі, у кнігах друкаваліся эфэктныя малюнкі з выявамі гіганцкіх мэталічных мяшалак і перагонных кубаў.
“Пасташута”, сьвятарная італьянская пасташута — сымбаль хатняга абеду, простага ў прыгатаваньні. Але, непрыдатная для гатаваньня ў сталоўках, у гамэрычных цэбрах, яна зрабілася аб’ектам нянавісьці да фашысцкага ладу…
Італьянскаму народу была прапанаваная вялікая мэта — бітва за ўраджай (дзіву даесься, да чаго ўсе нешчасьлівыя нацыі няшчасныя аднолькава). Выступаючы за ідэалы самадастатковасьці, фашысцкая прапаганда патрабавала ад народу зьменшыць спажываньне макароны, павялічваць спажываньне хлеба. Для атрыманьня жаданых аб’ёмаў пшаніцы мяккіх гатункаў (то бок, тых, што не падыходзяць для пасты праз брак у іх клейкавіны) Мусаліні абвясьціў новую дзяржаўную праграму. Паводле гэтай праграмы належала фармаваць узорныя землярobчыя калектывы сацыялістычнага кірунку. Правамерна было б назваць гэта калгасамі…
Там, дзе цалінныя землі нельга было ўзараць з прычыны іх забалочанасьці, іх асушылі. Першай задачай рэжыму стала правядзеньне мэліярацыі ў дзяржаўным маштабе... Перагібы




здараліся няспынна. Не паўсюль пшаніца давала ўраджай. Бо не ва ўсіх кліматычных умовах яна можа нармальна расьці. У дададатак дзе-нідзе ў рэгіёнах пад дзяржзамову — пшаніцу — пачалі араць агароды, пасьля чаго пачаў узьнікаць недахват памідораў. Каб у Італіі пачаўся дэфіцыт памідораў — гэта трэба было здолець зрабіць.
Ну, што ж — не пасьпелі, як той казаў, узяцца за хлеб, як зьніклі памідоры.
Аўтарка апісвае забаўны плякат часоў Мусаліні. Нейкі суб’ект у сурвэтцы есьць макарону, побач ляжыць смажаная кура, стаіць садавіна, графін зь віном, а за ім стаіць жаўнер у каляніяльнай форме і сьціскае рукі на горле едака са словамі: “Хто зашмат есьць, той рабуе Радзіму”. Цікава, што фашызм і камунізм нярэдка сыходзяцца, у тым ліку і ў сваім стаўленьні да ежы. Так, у 1960-я гады фашысты і камуністы разам з Ватыканам абрынуліся на… кока-колу як сымбаль амэрыканскага ладу жыцьця. Касьцюковіч цытуе тагачасны вершык італьянскага паэта-камуніста , які прыблізна можна перакласьці так:

> “За кожную бутэльку кока-колы
> Амэрыцы ты кулю аплаціў.
> Амэрыканскі снайпэр гэтай куляй
> таварыша вьетконгаўца забіў”.

## Parla come mangi

“Ежу” можна цытаваць зноў і зноў, але ўсё адно цытаты не дадуць поўнага ўяўленьня пра гэтую кнігу. Яе трэба прачытаць.
Варта сказаць яшчэ колькі словаў і пра саму аўтарку. Алена Касьцюковіч нарадзілася ў Кіеве, у сям’і пісьменьніка і мастака Леаніда Валынскага (Рабіновіча), які ўвайшоў у гісторыю тым, што падчас вайны ўзначаліў групу па ўратаваньні шэдэўраў Дрэздэнскай мастацкай галерэі. Як вядома, гітлераўцы зьбіраліся ўнікальную калекцыю зьнішчыць, але іхны плян быў сарваны — карціны пасьля вайны вярнуліся ў Дрэздэн. Касьцюковіч доўгі час жыла і працавала ў Маскве. У апошнія гады яна практычна не пакідае Італіі, выкладае там адразу ў некалькіх унівэрсітэтах, на аддзяленьнях славістыкі.
Варта згадаць італьянскую прымаўку, якую сама аўтарка лічыць найлепшым эпіграфам да сваёй кнігі. Parla come mangi. “Гавары так, як ясі”. Сэнс прымаўкі Касьцюковіч тлумачыць так. Калі нехта жыве ў нейкай мясцовасьці і харчуецца стравамі пэўнай кулінарнай школы, дык хай ён карыстаецца і “роднай моваю” гэтых страваў.
Іншымі словамі, ежа — гэта свайго роду мова нацыі. Такую думку выказаў вялікі знаўца італьянскай мовы Ўмбэрта Эка. У згаданай вышэй прадмове да кнігі Касьцюковіч ён піша: “Пазнаць італьянскую ежу ва ўсёй яе разнастайнасьці — значыць, адкрыць для сябе глыбокія адрознасьці смакаў і дыялектаў. Даведацца, наколькі мяняюцца ад мясьціны да мясьціны псыхалёгія, дух, пачуцьцё гумару, стаўленьне да болю й сьмерці”.
На гэтым можна было б паставіць кропку. Але вельмі хочацца выказаць спадзяваньне, што калі-небудзь падобная кніга зьявіцца і ў нас. Ведаў і таленту такім людзям, як Алесь Белы ці Сяргей Харэўскі, які ведае беларускую кухню ня толькі ў тэорыі, але бліскуча дэманструе майстэрства кухара на практыцы, не займаць. Ежа, без усялякага сумневу — гэта й беларускае шчасьце. І наўрад ці яно зводзіцца да ідэалу Міколкі-Паравоза: “сала з салам есьці”.
Засталося ўсяго толькі знайсьці і прааналізаваць старажытныя рэцэпты беларускай кухні ды аб’ехаць у пошуку старых і новых рэцэптаў, народнага духу і пачуцьця гумару ўсю Беларусь. Ну, і напісаць кнігу.
Дарогу адужае той, хто ідзе.

# Андрэй Курэйчык: «Я вольны геній»



**Андрэй Курэйчык**

нар. у 1980 у Менску. Аўтар шматлікіх п’есаў, якія пастаўленыя ў розных краінах сьвету, а таксама кінасцэнараў (пазнаёміцца зь імі можна на сайце драматурга www.kureichik.ru)

Драматург Андрэй Курэйчык нядаўна перабраўся на сталае жыхарства зь Менску ў вёску Турэц. У заяве, якую распаўсюдзіла прэс-служба драматурга, паведамлялася, што нейкі час Курэйчык быў наагул недасягальным для кантактаў. Ён памяняў тэлефоны, амаль не зьяўляецца ў Менску і адмаўляецца ад кантактаў з большасьцю знаёмых. Андрэй Курэйчык пакінуў выкладаньне ў сваёй Майстроўні ў Ліцэі БДУ, адмовіўся ад удзелу ў праекце «Тэатар Онлайн» фэстывалю «Панарама». Рэдакцыі ўдалося зьвязацца са спадаром Курэйчыкам і (пры дапамозе электроннай пошты) пагутарыць пра тое, чым цяпер жыве творца.

## Пра пераезд, асабістае жыцьцё, карані

**«Наша Ніва»: Менскія рыэлтэры гавораць, што апошнім часам назіраецца тэндэнцыя: людзі прадаюць кватэры ў горадзе і перабіраюцца ў прыватныя дамы пад Менск. Тым ня менш, такі пераезд знанага чалавека — неардынарная падзея. Раскажыце, калі ласка, чаму Вы вырашылі пераехаць?**

**Андрэй Курэйчык:** Мне складана гаварыць пра тэндэнцыі. Я не кіруюся імі ў сваіх рашэньнях. Мне хацелася зьехаць з гораду і жыць у сваім доме. Я гэта зрабіў. Мне хацелася знайсьці сьветлае месца, дзе маё сьвядомае адасабленьне, мая сьвядомая самота ня будзе турмой, а будзе месцам для шчасьця і вольнай творчасьці. Мяркую, у гэтай вёсцы ніхто ня ведае, чым я займаюся. Мне прыемна, што тут я, нарэшце, стаў цалкам непублічнай фігурай.

**«НН»: Чаму Вы выбралі менавіта Турэц? З гэтай вёскай у Вас нешта зьвязанае?**

**АК:** Мне падабаецца, што гэта сапраўдная старадаўняя вёска, а ня новабеларускае катэджнае мястэчка для зладзеяватых чыноўнікаў. Гэта мае радавыя мясьціны. Непадалёк, у Сьмілавічах, жыве мая бабуля — чалавек, ад якога я атрымаў у спадчыну творчую жылку. Тамсама жывуць і іншыя мае сваякі. Дарэчы, у Сьмілавічах жыў Хаім Суцін — адзін з найвялікшых мастакоў XX стагодзьдзя, карціны якога каштуюць мільёны даляраў. Родзічы па бацькоўскай лініі таксама з навакольных вёсак — Дукоршчыны ды Запольля. Менавіта гэтыя землі асацыююцца ў мяне з паняткам Радзіма.

**«НН»: Раскажыце пра Ваш дом? Які ён?**

**АК:** Утульны і сьветлы. Я думаю, ён, пэўна, стане апошнім літаратурным маёнткам у нашай краіне... Мне вельмі шкада, што гэтая традыцыя сыходзіць. Я магу зразумець, чаму пісьменьнікі імкнуліся ў вёску: Пушкін, Талсты, Чэхаў, Бунін, Валошын — гэты сьпіс можна працягваць да бясконцасьці... А ўспомніць тое ж Перадзелкіна ў савецкія гады... Так што ў мяне самы звычайны пісьменьніцкі дом.

**«НН»: Якія першыя ўражаньні ад жыцьця ў беларускай вёсцы?**

**АК:** Гэта тое жыцьцё, якое мы забылі ў вялікіх гарадах. Тут мала што зьмянілася з XIX стагодзьдзя. У мяне на вуліцы прарвала трубу і некалькі месяцаў адтуль ліецца, аж хвошча вада. Сапраўдны патоп, а нікога не хвалюе... Сто гадоў пройдзе, і ўсё роўна гэта ня будзе нікога хваляваць. Затое нават незнаёмыя людзі, сустракаючыся на вуліцах, вітаюцца. У краме табе расказваюць навіны... Час тут цячэ інакш... Ёсьць у гэтым жыцьці нешта пранізьліва-кранальнае і сапраўднае.

**«НН»: Як паставілася да пераезду Вашая жонка-акторка? Ці ёсьць людзі, якія дапамагаюць ёй па гаспадарцы? Як Вы зьбіраецеся арганізаваць тут жыцьцё Вашага маленькага сына?**

**АК:** Мая жонка не ў захапленьні. Наагул, мала хто мяне адобрыў. Але яна мяне кахае і прыняла маё рашэньне. Іншага я ад яе і не чакаў. Мой сын — здаровы і вясёлы пузацік, які, як сонца, асьвятляе нашае з Вольгай жыцьцё нават у гэтую змрочную пару году...

**«НН»: Што думаюць наконт Вашага пераезду Вашыя бацькі і бацькі Вашай жонкі? Яны жывуць з Вамі?**

**АК:** Бацькі засталіся ў

Менску. Думаю, яны былі супраць. Я гэта зь імі не абмяркоўваю.

### Пра тэатар ідэальны і рэальны

**«НН»: Клясык заклікаў любіць тэатар і памерці ў тэатры, «калі можаце». Вашае стаўленьне да беларускага тэатру досыць крытычнае. А ці існуе такі тэатар (у нас у краіне ці за межамі), які здаецца Вам ідэальным, такім, у якім варта нават памерці?**

**АК:** Я не люблю гэтага патасу. Ніякі тэатар ня варты сьмерці ці жыцьця ня тое што чалавека, а нават сабакі. Ёсьць мільён больш важных, чым спэктаклі, рэчаў у жыцьці нармальнага чалавека: ягонае здароўе, сям’я, дзеці, бацькі, дабрабыт. Тэатар — усяго толькі гульня для дарослых, спосаб самавыяўленьня і прафэсійнай рэалізацыі для актораў, драматургаў і рэжысэраў і забава для гледачоў. Пытаньне адно ва ўзроўні таленту. Гісторыя ведае шмат геніяльных спэктакляў, рэжысэраў і актораў... На дадзены момант у Беларусі я такіх ня бачу. Тэатар перастаў быць цэнтрам маёй увагі.

**«НН»: Вы маеце досьвед працы ў кіно і тэатры. Што падаецца Вам больш прывабным? Што Вам, як аўтару, больш падабаецца: тэатральная п’еса «Выканаўца жаданьняў» ці сцэнар «Любовь-морковь» паводле яе матываў?**

**АК:** І да таго, і да другога стаўлюся іранічна. Гэты сюжэт — проста жарт, рады, калі ён кагосьці забавіў.

**«НН»: Чым Вы зьбіраецеся займацца цяпер, над чым працуеце? Якія тэмы падаюцца Вам вартымі таго, каб над імі працаваць?**

**АК:** Прапаноўваў цяпер больш, чым магу адужаць фізычна. Ад многага даводзіцца адмаўляцца. Дапісваю сцэнар для амэрыканскіх замоўнікаў. Вельмі няпросты міжнародны праект. Дапрацоўваю новую кінакамэдыю. Пішу сур’ёзны раман. Усе сюжэты — пра чалавечыя лёсы, складаная і неадназначныя. Задаволены далёка ня ўсім. Сапраўднае мастацтва нараджаецца рэдка. Пра ўсё будзеце даведвацца па меры вытворчасьці. Закончыліся здымкі майго другога фільму — «Юлечка». Прадусары кажуць, што матэрыял вельмі цікавы. Зімой пачнуць здымаць працяг «Любовь-морковь». Вясной яшчэ нешта...

### Пра беларускасьць і беларускія грамадзкія рэаліі

**«НН»: Рыхтуючыся да інтэрвію з Вамі, знайшла ў інтэрнэце, што Вы рэдагавалі газэту «Вестник культуры», і са зьдзіўленьнем пабачыла, што з гэтай газэтай адбылася такая ж гісторыя, як з «НН»: «Белсаюздрук» разарваў дамову на распаўсюд. Але, у адрозненьне ад «НН», гэта дзяржаўная газэта (наколькі я зразумела). Чаму і як такое адбылося?**

**АК:** «Вестник культуры» — выданьне недзяржаўнае. Яно заснаванае і выдаецца літаратурным саюзам «Полацкая галіна» — недзяржаўным і незалежным саюзам пісьменьнікаў з цэнтрам у Полацку. Як вядома, у нас незалежныя саюзы пісьменьнікаў не ў фаворы ў чыноўнікаў, так што таму, што адбылося, зьдзіўляцца ня варта.

**«НН»: Вы аўтар многіх п’есаў, але толькі тры зь іх існуюць па-беларуску (калі не памыляюся). Чаму так? Вы ня лічыце вартым клапаціцца пра пераклад, бо па-беларуску чытаюць і ў беларускія тэатры ходзяць нямногія?**

**АК:** На жаль, я не валодаю беларускай літаратурнай мовай настолькі, каб на ёй думаць. Гэта мая бяда. Таму пішу на мове сваіх думак — на расейскай. Але мне вельмі хацелася б бачыць пераклады сваіх п’есаў на беларускую. Шкада, што тэатры ды выдавецтвы не паклапаціліся пра гэта...

**«НН»: Вы чалавек вельмі дынамічны, працавалі і бывалі ў многіх краінах, тым ня менш набылі дом менавіта тут, на радзіме. Чаму? Вам камфортна ў Беларусі? Ніколі ня думалі пра тое, каб зьехаць у тую ж Маскву ці яшчэ куды?**

**АК:** Я пажыў у Амэрыцы, Нямеччыне, Англіі, Расеі. Пабываў у 19 краінах сьвету. Я мог бы застацца ў большасьці зь іх, калі б захацеў... Але я пісьменьнік. Я жыву там, дзе мне лепш пішацца. У дадзены момант мая краіна — 18 сотак зямлі ў вёсцы Турэц. Але гэта гордая і вольная дзяржава. Я ня маю ілюзіяў наконт сваёй запатрабаванасьці ў Беларусі. Мабыць, я ня вельмі зручны аўтар. Тут цэняць уменьне быць падлізьнікам. Прычым гэта датычыць і ўлады, і апазыцыі. Мне пляваць. Я не хачу ні перад кім прыніжацца. Нікога ні пра што прасіць. Не хачу мяняць свае перакананьні, каб дагадзіць кан’юнктуры. А галоўнае, я ведаць не хачу ўсіх тых няздараў, ідыётаў, нягоднікаў ды крывадушнікаў, зь якімі даводзілася сутыкацца ў сталіцы, якой бы палітычнай і культурнай арыентацыі яны ні былі. Я выкрасьліў гэты бруд ды пошласьць са свайго жыцьця. І абсалютна сабой задаволены.

**«НН»: Кім сябе адчувае Андрэй Курэйчык: беларускім драматургам, чалавекам расейскай культуры, грамадзянінам сьвету, грамадзянінам Саюзнай дзяржавы ці кімсьці яшчэ?**

**АК:** Вольным геніем.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

Календар

са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.






**Аляксей Жыгалковіч перамог на дзіцячым "Эўрабачаньні". Удзел у эўрапейскіх поп-шоў застаецца справай гонару і геройства для беларусаў.**

# Эўракамісія шукае шляхі скарачэньня дарожнага шуму

Эўрапейская фэдэрацыя транспарту і абароны навакольнага асяродзьдзя (T&E) выпусьціла дакумэнт, які тычыцца паднятай Эўрапейскай Камісіяй праблемы дарожнага шуму. Плянуецца ўвядзеньне новай Дырэктывы, паводле якой шум ад транспарту мае быць зьніжаным.

## Шкодны шум

Паводле статыстыкі, больш за 200 мільёнаў грамадзянаў Эўрасаюзу жывуць сёньня ва ўмовах моцнага дарожнага шуму, што нэгатыўна ўзьдзейнічае на іхнае здароўе, прычым 90% гэтага шуму выкліканыя легкавымі машынамі і грузавікамі. Дырэктыва 2001/43/EC, што дзейнічае цяпер, лічыцца не дастаткова дзейснай, і да 2012 году прапанавана распрацаваць новую, якая будзе лепей абараняць экалёгію і здароўе грамадзянаў.

Экспэрты сьцьвярджаюць, што выкарыстаньне шынаў з больш нізкім узроўнем шуму — безумоўна, самы рэнтабэльны і рэальны мэтад вырашэньня праблемы. Таксама прапанавана распрацаваць дарожныя пакрыцьці, што паглынаюць дарожны шум. У дакумэнце падкрэсьліваецца, што новыя тэхналёгіі, неабходныя для зьніжэньня ўзроўню шуму, ужо існуюць і што ўвага да гэтай праблемы можа палепшыць ня толькі экалягічную сытуацыю ў Эўрасаюзе, але і эканамічную.

## Што высьветліла T&E

Тэма дарожнага шуму актуальная і для гарадоў Беларусі. Але, на жаль, нам яшчэ далёка да яе абмеркаваньня…

А эўрапейская фэдэрацыя транспарту і абароны навакольнага асяродзьдзя (T&E) на сваім ўэб–сайце www.transportenvironment.org абвясьціла некаторыя вынікі сваіх дасьледаваньняў па «шумавай» тэме. Згодна з T&E, большая частка шуму сыходзіць менавіта ад шынаў, якія пастаянна кантактуюць з паверхняю дарогі. Пры хуткасьці вышэй за 30 км/г для легкавых аўтамабіляў і 50 км/г для грузавікоў шум ад шынаў пераважае над шумам руханіка. І гэтая праблема становіцца ўсё больш відавочнай, бо расьце попыт на ўсё больш шырокія шыны.

Дарэчы, зьяўленьню дакумэнта T&E пра дарожны шум папярэднічаў адкрыты ліст камісару Эўракамісіі па пытаньнях прадпрыміальніцтва і прамысловасьці Гюнтару Вэрхеену, скіраваны Эўрапейскай асацыяцыяй вытворцаў шынаў і каўчуку (ETRMA).

Гэтым дакумэнтам ETRMA бярэ на сябе абавязак зрабіць захады па зьніжэньні ўзроўню шуму ад шынаў на 2 дэцыбэлы, а таксама па скарачэньні выхлапаў $CO_2$ да 5 грамаў на кілямэтар. Гэтага можна дасягнуць, зрабіўшы шэраг захадаў, уключаючы прасоўваньне шынаў зь нізкім узроўнем супраціўленьня качэньню, а таксама камплектацыю ўсіх аўтамабіляў сыстэмамі кантролю ціску ў шынах. У сваім адкрытым лісьце асацыяцыя вытворцаў шынаў выразіла сваю пазыцыю, што больш істотнага зьніжэньня шуму можна дасягнуць, зьмяніўшы матэрыялы, што выкарыстоўваюцца пры вытворчасьці дарожных пакрыцьцяў, акрамя гэтага, зьнізіць шкоднае ўзьдзеяньне на навакольнае асяродзьдзе можа забарона доступу на эўрапейскі рынак пэўных відаў прадукцыі. Акцэнт зроблены на тым, што "для зьніжэньня ўзьдзеяньня на навакольнае асяродзьдзе і павышэньня бясьпекі неабходна прадухіліць імпарт на эўрапейскі рынак прадукцыі, якая не адпавядае запатрабаваным стандартам бясьпекі". Прапанаванае асацыяцыяй зьніжэньне шуму на 2 дэцыбэлы (добраахвотны захад) — гэта меней за паказчык, рэкамэндаваны згодна з вынікамі дасьледаваньня, праведзенага Форумам эўрапейскіх нацыянальных навукова–дасьледніцкіх лябараторыяў дарожнага руху (FEHRL) пад кіраўніцтвам Навукова–дасьледніцкай транспартнай лябараторыі Вялікабрытаніі. Дасьледаваньне было праведзенае з ініцыятывы Эўракамісіі, яго вынікам стала інфармацыя, неабходная для ўнясеньня зьменаў у Дырэктыву 2001/43/EC. У справаздачы пра праведзенае дасьледаваньне FEHRL паведамляе, што "ў кароткатэрміновай пэрспэктыве магчымае зьніжэньне шуму на 3 дэцыбэлы", а ў доўгатэрміновай пэрспэктыве магчымае зьніжэньне да 5 дэцыбэлаў.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўрасаюзу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭС.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

## Ад чацьвярга — мароз, мароз

З чацьвярга ў Беларусь вяртаецца зіма: сьнег, галалёдзіца, сівер. Тэмпэратура паветра апусьціцца да 1—8°С ніжэй за нуль. У пятніцу мароз дасягне мінус 4—9°С, па поўначы пры выясьненьнях да мінус 12°С.

## У Валожыне абрынуўся пяціпавярховік

У нядзелю а шостай раніцы дзяжурная зьмена аддзяленьня хірургіі Валожынскай больніцы сьцепанулася ад грукату: уся цэнтральная частка недабудаванага пяціпавярховага корпусу асела зь пятага на першы паверх. Будоўля акушэрска-гінэкалягічнага корпусу вялося з 1992 да 1997 гадоў. Цагляную каробку паставілі, а страху так і не пасьцялілі. Неўзабаве ўсе працы на аб’екце замарозілі. Гады зрабілі сваю справу. Папярэдняя прычына інцыдэнту — падмываньне падмурку. Цяпер работнікі праектнага інстытуту вырашаюць, як разьбіраць рэшткі пяціпавярховіка. Варыянтаў два: скіраваны выбух альбо сьценабітная машына.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Валожын. Недабуды 90-х сталі крыніцай небясьпекі.

## Утрамбоўцы пасажыраў зьявіліся ў Кіеве

У гадзіны пік бывае проста нерэальна ўціснуцца ў вагон мэтро. У кіеўскім мэтрапалітэне на трох самых людных станцыях на «дапамогу» жыхарам сталіцы прыходзяць адмысловыя «ўтрамбоўцы», якія літаральна запіхваюць людзей у цягнік.

## Беларусы спрыяюць віленскаму мэтро

Ня выключана, што ў бліжэйшыя гады ў Вільні будзе пабудавана мэтро. Гэты праект карыстаецца папулярнасьцю сярод літоўскага грамадзтва, а рэалізацыі актыўна спрыяюць прадстаўнікі Менскага мэтрапалітэну. Літоўцаў цікавяць тэхналёгія і бурыльныя машыны.

## Пабачыў краіну Лукашэнкі і працьверазеў

Грамадзянін Швайцарыі, які днямі папрасіў палітычнага прытулку ў Беларусі, перадумаў жыць у нашай краіне. Як паведамілі ў Берасьцейскай памежнай групе, 8 сьнежня ён пакінуў Цэнтар разьмяшчэньня мігрантаў у Берасьці і вярнуўся на радзіму. 28 лістапада грамадзянін Швайцарыі на аўтамабілі «жыгулі» перасёк беларуска-польскую мяжу і папрасіў палітычнага прытулку ў нашай краіне. Ён паведаміў памежнікам, што Беларусь, Вэнэсуэла і Куба — гэта найлепшыя на сьвеце дзяржавы. У аўто, акрамя асабістых рэчаў, быў таксама збор сачыненьняў Леніна. Аднак пасьля 10-дзённага знаходжаньня ў Цэнтры разьмяшчэньня мігрантаў у Берасьці грамадзянін Швайцарыі перадумаў і зьехаў дадому.

## Да 17 сьнежня можна назіраць за зьнічкамі

На небе бачны адзін з самых буйных штогадовых мэтэорных патокаў — Гемініды. Самым зорным днём гэтага месяца стане 14-ты: на бясхмарным начным небе за гадзіну можна пабачыць да 120 яркіх мэтэораў, якія ляцяць з боку сузор’я Блізьнятаў. У адрозьненьне ад Леанідаў, якія вельмі хуткія і часта пакідаюць за сабой размытыя сьляды, Гемініды значна павальнейшыя (іх хуткасьць 35 км/г). Мэтэоры будуць добра бачныя, бо ім спадарожнічае Маладзік. Штогадовыя назіраньні за Гемінідамі паказваюць, што максымальная актыўнасьць патоку няўхільна павялічваецца. Гэтак, у 1977 годзе колькасьць назіраных мэтэораў складала прыблізна 14 у гадзіну, у 1986 годзе — каля 23 у гадзіну, у 1999 годзе — 90. Астраномы прагназуць і далейшы рост актыўнасьці, зьвязваючы гэта з гравітацыйным узьдзеяньнем на мэтэорны паток самай вялікай плянэты Сонечнай сыстэмы — Юпітэра.

## Альбанцы прадалі матч беларусам?

У лісьце, скіраваным у УЭФА, міністар культуры Альбаніі Ільлі Панга заклікае арганізацыю расьсьледаваць два апошнія матчы альбанцаў у адборачным этапе на Эўра-2008 з камандамі Беларусі і Румыніі. «Абедзьве гульні, імаверна, былі прададзеныя прэзыдэнтам фэдэрацыі футболу Арманда Дука”. «Гэтая каманда — гэта бандыцкая групоўка, якая топча нацыянальны сьцяг», — перадае Reuters словы прэм’ер-міністра Альбаніі Салі Бэрышы.

**буг; «Рэспубліка», generation.by, радыё “Рацыя”, БЕЛТА**

# Невядомая Суомі




Калі спытаць кожнага другога беларуса, якую дзяржаву ён лічыць узорам для сваёй радзімы, можна быць пэўным, што пачуеш: «Фінляндыю». І гэта мае ў нас даўнюю традыцыю. Свае творы краіне Суомі прысьвячалі Янка Купала, Цётка, Максім Танк. Танк пісаў:

Хіба таму, што я з такога ж краю,
Які не перад кожным раскрывае
Адразу хараство сваіх прастораў,
Лясоў, далін, узгоркаў і азёраў, —
Мне спадабалася зямля Суомі
У шуме сосен, вадаспадаў громе...

Можна правесьці шмат паралеляў паміж нашай краінай і Фінляндыяй. Як і Беларусь, Суомі — «край азёраў, край лясоў», а яшчэ — балотаў. Менавіта так — «краіна балотаў» — перакладаецца швэдзкае «Фінлянд» і фінскае «Суомі». Як і нас, фінаў лічылі на пачатку мінулага стагодзьдзя нацыяй сялянскай, а значыць — негістарычнай. Беларускае фіназнаўства мае традыцыі. Праводзіліся паралелі: Францыск Скарына — фінскі першадрукар Мікаль Агрыкала (Якуб Лапатка). Янка Купала — фінскі паэт Эйна Лейна. Алесь Аркуш пісаў пра «беларускіх Манэргеймаў».

І ўсё ж, ведаем мы пра фінаў да крыўднага мала. Мяркуюць, што яшчэ да Н. Х. фіна-вугорскія плямёны жылі на тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны. У гістарычны час продкі сучасных фінаў падтрымлівалі сувязь зь Бізантыяй праз знакаміты шлях «З варагаў у грэкі». Мяркуюць, што маці Ўсяслава Чарадзея мела фіна-вугорскае паходжаньне, што нельга выключаць, бо тагачасныя крыніцы згадваюць «каралёў» фіна-вугорскіх плямёнаў. Адзінай дзяржавы ў іх, аднак, не існавала. Першы шанец на дзяржаўнасьць зьявіўся ў фінаў толькі ў XVI ст. Кароль Швэцыі прызначыў свайго сына Юхана Вазу герцагам Фінляндыі. Юхан (1556—1563) праводзіў фактычна незалежную ад Стакгольму палітыку. Для замацаваньня сваёй самастойнасьці герцаг ажаніўся з Кацярынай Ягелёнкай — дачкой караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта Старога і Боны Сфорца. Вялікую князёўну давялося адбіць у самога Іван Жахлівага. І герцагу Юхану, ды і ўсёй Фінляндыі не давялося пра гэта шкадаваць. Дачка італьянкі Боны прынесла ў паўночную Суомі Рэнэсанс. Замак у Турку, рэзыдэнцыя герцага Вазы, пабудаваны як абарончае ўмацаваньне, набыў эстэтычны выгляд. Тут зьявіліся панэлі, габэлены, мастацкая лепка.

Брат Юхана, кароль Швэцыі Эрык XIV (драму пра яго ставіў Купалаўскі тэатар), быў занепакоены ростам самастойнасьці Фінляндыі. У 1563 г. ён пайшоў на брата вайной. Юхан трапіў у палон. Кацярыне была прапанаваная свабода, але яна вырашыла падзяліць лёс мужа. Гэтае трагічнае каханьне апеў клясык фінскай літаратуры Эйна Лейна.

Ад Юхана і Кацярыны паходзіць тая галіна дынастыі Ваза, якая каралявала ў Рэчы Паспалітай. Фінляндзкая шляхта імкнулася перайсьці ў падданства да нашчадкаў герцага Юхана. Узначальваў фінляндзкіх сэпаратыстаў намесьнік Флемінг. Стакгольм скарыстаўся супярэчнасьцямі паміж сялянамі і шляхтай, справакаваўшы найбуйнейшую ў гісторыі Фінляндыі сялянскую «дубінную» вайну (1596—1597). Пасьля яе ўлада швэдзкай кароны над Суомі была адноўленая.

Фінляндзкі сэпаратызм адрадзіўся ў XVIII ст. Бесьперапынныя войны Швэцыі з Расеяй навялі частку адукаванага грамадзтва на думку пра фінскую самастойнасьць. Прыхільнікі гэтай ідэі ўтварылі так званую Аньяльскую канфэдэрацыю на чале з графам Стрэгоптрэнам. Гэтак сама, як тая частка ліцьвінскай шляхты імкнулася скарыстацца падзеламі Рэчы Паспалітай для адраджэньня ВКЛ (канцлер Яхім Храптовіч, гетман Касоўскі, а пазьней і Міхал Клеафас Агінскі), аньяльцы спадзяваліся на дапамогу Расеі. Стрэгоптрэн атрымаў у 1786 ад Кацярыны II маёнтак у Беларусі.

Высілкі Стрэгоптрэна і ягоных паплечнікаў не былі марнымі. Хоць



швэдзкаму каралю Густаву Адольфу і ўдалося задушыць Аньяльскую канфэдэрацыю, фінляндзкія незалежнікі змаглі скарыстацца сытуацыяй, што склалася ў выніку расейска-швэдзкай вайны 1808 г. На сойме ў Прове было абвешчана стварэньне фінскай аўтаноміі. І хаця Вялікае княства Фінляндзкае не было цалкам самастойным, першы крок быў зроблены. Расея прызнала, што Фінляндыя зьяўляецца «дзяржавай, а не губэрняй».

Аднак у краіне працягвалася панаваньне швэдзкай культуры. Спатрэбілася стварэньне «Калевалы» Эліясам Лёнратам, каб сьвет даведаўся, што ў фінаў ёсьць «свая гісторыя, свая міталёгія». «Калевала» спрыяла станаўленьню нацыянальнай літаратуры ў эстонцаў, латышоў, якутаў. Яна аказала ўплыў на такія сусьветна вядомыя творы, як «Сьпеў пра Гаявату» Лангфэла і «Ўладар пярсьцёнкаў» Толкіена.

Захапляліся фінскім эпасам і нашыя клясыкі. Янка Купала згадвае «Калевалу» ў вершы «Фінляндыя». Якуб Колас казаў, што «Калевала» для яго мае большае значэньне за «Фаўста» Гётэ. Вацлаў Ластоўскі марыў пра беларускую «Калевалу». Максім Багдановіч працаваў над перакладам нацыянальнай паэмы Суомі. Лёс гэтага перакладу, на жаль, невядомы, і на сёньня мы маем па-беларуску толькі лёнратаўскі ўступ дзякуючы Янку Сіпакову.

Максім Багдановіч пераклаў таксама ўрывак з паэмы «Пава» Юхана Людвіга Рунэбэрга, чыя творчасьць для фінаў ня менш важная за «Калевалу»:

Блізка рэчкі горнай Сарыяві
Жыў сабе ды гаспадарыў Пава
Меў ён жонку ды дзяцей з асьміну
Разам зь імі і гараў і сеяў, а пасьля еў хлеб запрацаваны.

Дарэчы, у выдадзеным у Пецярбургу бібліяграфічным сьпісе перакладаў твораў фінскага клясыка на мовы сьвету беларуская адсутнічае.

Рунэбэрг зрабіў шмат для нацыянальнага самаўсьведамленьня фінаў. Як і Якуб Колас, Рунэбэрг апеў у эпічным стылі сялянскае жыцьцё свайго народу ў паэме «Апавяданьні прапаршчыка Стодля», паказаў змаганьні фінаў з захопнікамі. Пачатак гэтага твору зьяўляецца нацыянальным гімнам Фінляндыі.

Рунэбэрг пісаў яшчэ па-швэдзку. Вацлаў Ластоўскі параўноўваў яго з Адамам Міцкевічам і Ўладзіславам Сыракомлем. Але з часам літаратура на фінскай мове набывае ўсё большую дасканаласьць.

Сусьветную вядомасьць атрымала творчасьць кампазытара Яна Сібеліюса.

Аднак пры канцы XIX ст. нацыянальная ідэнтычнасьць Фінляндыі аказалася пад пагрозай. Мікалай II паспрабаваў зьліквідаваць аўтаномію Фінляндыі, парушыўшы тым самым, са словаў Карла Густава Манэргейма, які ў той час служыў у Горадні, «прысягу, дадзеную ягонымі папярэднікамі». У рэшце рэшт, спроба зрусіфікаваць Фінляндыю сарвалася. Пасланы з гэтай мэтай у краіну генэрал-губэрнатар Бобрыкаў быў забіты, а фіны атрымалі ўсеагульнае выбарчае права. Фінляндыя працягвала заставацца «чырвонай хусткай» для прыхільнікаў адзінай і непадзельнай.


Маршал Манэргейм вырас з генерала Расейскай імпэрыі.

Фінляндыю наведвалі Янка Купала і Алаіза Пашкевіч (Цётка). Вынікам Купалавай вандроўкі стаў верш «Над Іматрай». Для паэта вадаспад Іматра робіцца нібы сымбалем нескаронай Суомі і яе гордага народу:

Шалее Іматра між каменных глыбаў,
За хваляю хвалю імчыць к нізіне...
Другія іх зьменяць і пеняцца ў зломе,
Адвечністым шумам калышуць прастор;
Свабодай сваёю і роднай Суомі
Сягнуць быццам хочуць да зор.

У сваім нарысе «Зь Фінляндыі» Купала адзначае беднасьць і непрывабнасьць мясцовай прыроды: «Як жа багацейша і пякнейша наша зямелька, калі яе параўнаць зь фінскай». І ў той жа час заможнае разьняволенае жыцьцё мясцовага люду: «Людзі тут ... свабадней выглядаюць, як нашы... Ніхто нікога ні аб чым не пытаецца, ніхто нікога не пільнуе...»

Барацьба фінскага народу супраць царызму завершылася абвяшчэньнем 7 сьнежня 1917 г. незалежнасьці дзяржавы. Але амаль адразу пачалася крывавая грамадзянская вайна паміж белымі і чырвонымі фінамі. Перамога белых замацавала сувэрэнітэт Суомі, але доўга яшчэ ў краіне захоўваўся падзел на пераможцаў і пераможаных. Тым ня менш, калі Сталін абвясьціў Суомі вайну, чырвоныя і белыя разам выступілі на абарону сваёй краіны. Чым растлумачыць такі фэномэн? Чаму такога не адбылося ў прыбалтыйскіх краінах. Як вядома, у Прыбалтыцы панавалі дыктатарскія рэжымы: Сьмятоны ў Літве, Ульманіса ў Латвіі, Пяста ў Эстоніі. Усе яны прыйшлі да ўлады ў выніку пераваротаў і былі нелегітымныя, таму і не адважыліся даць народу зброю. У Фінляндыі, нягледзячы на шматлікія спробы, пераварот не адбыўся. Фінам і ў галаву не магло прыйсьці павярнуць зброю супраць імі ж абранага ўраду.

Фінляндыі давялося прайсьці складаны шлях. Быў і саюз з Гітлерам, і шматгадовае сяброўства з СССР. У такіх няпростых умовах фіны змаглі захаваць свой сувэрэнітэт, дзевяностагодзьдзе якога яны сёньня сьвяткуюць.

**Вацлаў Шаблінскі**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

## «БЕЛСАТ» пачаў працу

Глядзець канал можна штодня праз спадарожнік ад 18-й гадзіны. Дасяжны да прагляду таксама афіцыйны сайт тэлеканалу **www.belsat.eu з раскладам праграмаў.** Тамсама ў разьдзеле «Як нас знайсьці» падрабязна тлумачыцца працэдура настройкі спадарожнікавай антэны на сыгнал «Белсату». Кіраўніцтва каналу абяцае, што са студзеня яго можна будзе глядзець праз магутны спадарожнік «Сырыюс». Пакуль жа «Белсат» перадаецца праз спадарожнік «Астра». Вось яго настройкі: Астра1KR: 10773 MHz, H, 22000, 5/6.

## Данчык на Ўправе

19 сьнежня (серада) на Ўправе БНФ пройдзе прээзэнтацыя дыскаў Данчыка «Беларусачка», «Мы адной табе належым», «Равесьнікі». Адбудзецца паказ фільму «Данчык» і рарытэтных відэа-матэрыялаў. Выступяць аматары творчасьці сьпевака. Пачатак а 18:00. Уваход вольны. Даведкі: (029)649-08-88

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Два ў адным

Кінафармат «4х4»: новая стужка Кіры Муратавай — пра дыктатуру. Дыктатуру зьнямоглага эратамана — і дыктатуру сьсівелых рэчаў.

**Два ў адным** (Два в одном)

Украіна — Расея, 2007, каляровы, 124 хв.

**Рэжысэрка:** Кіра Муратава

**Ролі выконваюць:** Натальля Бузько, Рэната Ліцьвінава, Багдан Ступка, Ніна Русланава, Аляксандар Башыраў

**Жанр:** Абсурдысцкая арт-камэдыя паводле сцэнару Рэнаты Ліцьвінавай і Яўгенія Галубенкі

**Адзнака:** 6 (з 10)

У дэкарацыях тэатру павесіўся актор. Але спэктакль зрываць нельга, і прадстаўленьне ідзе ў прысутнасьці трупа. Пастаўленая п'еса прысьвечаная старому эратаману, які прымушае дачку прывесьці яму палюбоўніцу (Ліцьвінава)…

Новая стужка Кіры Муратавай — пра дыктатуру. Дыктатуру зьнямоглага эратамана, які ня здольны, і дыктатуру «культурніцкіх» рэчаў, якія ўжо не патрэбныя. Гнюсны маналёг Гамлета ў выкананьні Аляксандра Башырава, моўныя маразмы й штампы (фірмовы прыём Муратавай), гратэскныя рубэнсаўскія жанчыны (у натуры й скульптурах)... Парэзаныя рэпрадукцыі з аголенымі жанчынамі, старая парнаграфія, і за кампанію сіплагалосы, вусаты пэрсанаж у тэлевізары.

«Відны мужчына — зайздросьліва прамаўляе эратаман (Багдана Ступка). — Ніхто адсюль ня сыдзе, пакуль я ня кончу!»

Герой ня кончыў. Народ уцёк.

Такі лёс дыктатуры.

Абсурдна-мізантрапічная стужка Муратавай для зацятых кінаманаў.

Фільм будзе дэманстравацца з 20 да 23 сьнежня.

**Андрэй Расінскі**

## КАНЦЭРТЫ

### Калядны фэст

**Калядны фэст** — вялікі карнавальны канцэрт, які пачнецца **а 18-й гадзіне 25 сьнежня ў клюбе «Стэп»** (вул. Прытыцкага, 62). Удзельнічаюць гурты розных стыляў — ад фолку да рок-мэдывалю: «Стары Ольса», «Тэстамэнтум Тэррэ», «Ліцьвінскі хмель», «Келіх кола», ««Гальярда», «ЛітвінТроль» і інш., а таксама Тодар Кашкурэвіч, дуэт Натальлі і Дзяніса Сухіх. Танцавальная падтрымка ад гуртоў «Явары-на» і «Гістрыён». Кветкі прадаюцца ў пераходах станцыяў мэтро «Плошча Якуба Коласа» і «Кастрычніцкая». Даведкі праз т. 649-08-88, 766-24-25. Каляды — старажытны абрадавы карнавал, таму падчас фэсту вітаецца выкарыстаньне масак, пераапрананьне і эксцэнтрычныя паводзіны.

### Народны альбом

Старыя добрыя Казік і Юзік, Болек і Лёлек, Аліцыя з Адэлькаю, а таксама Кася Камоцкая, Лявон Вольскі, Зьміцер Вайцюшкевіч, Міхал Анемпадыстаў ды іншыя зоркі запрашаюць разам адсьвяткаваць 10-годзьдзе Народнага альбому. Сьпевы, танцы і сардэчныя сустрэчы адбудуцца **18 сьнежня ў клюбе Фартуна** (вул.Смаленская 15). Сьпяшайцеся на самы пасьпяховы і дасьціпны м'юзыкал пра жыцьцё ў мястэчку Ракаў у Заходняй Беларусі — паміж дзьвюма войнамі, паміж дзьвюма імпэрыямі. Як жылі, пяялі, танчылі, выпівалі, любіліся й біліся тутэйшыя — беларусы і габрэі, палякі і расейцы. Геніяльная стылізацыя Міхала Анемпадыстава, душэўная праца мэгазорак беларускага року, выдатнае шоў, дзе ёсьць кпіны й лірыка, бойкі й скокі, кава й піва з цынамонам. Адмыслова на юбілей НА з Бэрліна прылятае Вераніка Круглова («Крыві»).

### Калядны канцэрт

16 сьнежня (нядзеля) **а 16-й у Доме Ваньковічаў** (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) адбудзецца Калядны канцэрт у рамках міжнароднага праекту «Маладыя галасы». Прагучаць шэдэўры сусьветнай опэрнай клясыкі ў выкананьні студэнтаў Беларускай акадэміі музыкі Тэй Пэй Ю, Кацярыны Мельнікавай, Канстанціна Батурына

## ВЫСТАВЫ

### Падарожныя нататкі. Эўропа

Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску пры падтрымцы Швэдзкага Інстытуту, сумесна з партнэрамі — Гётэ-Інстытутам, Польскім інстытутам у Менску, Пасольствам Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь,— арганізуе міжнародны фатаграфічна-графічны праект-выставу «Падарожныя нататкі. Эўропа», адкрыцьцё якога адбудзецца **18 сьнежня а 17-й у Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва** (пр. Незалежнасьці, 47), і які будзе вандраваць па сямі гарадах Беларусі на працягу 2008 году: 18.12.2007 — 20.01.2008 Менск, Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва; 24.1. — 7.3.2008 Гомель, Карцінная галерэя Вашчанкі; 13.3. — 20.4.2008 Магілёў, Абласны мастацкі музэй імя Масьленікава; 24.4. — 31.5.2008 Горадня, Дзяржаўны гісторыка-археалягічны музэй; 5.6. — 6.7.2008 Баранавічы, Выставачная заля Краязнаўчага музэю; 10.7. — 31.8.2008 Берасьце, Музэй «Выратаваныя мастацкія каштоўнасьці» і Абласны краязнаўчы музэй; 4.9. — 5.10.2008 Полацак, Мастацкая галерэя.

Мастакі — удзельнікі праекту: Юры Алісевіч, графіка (Беларусь); Томас Будрыс, фатаграфія (Літва); Аляксандар Вахрамееў, графіка (Беларусь); Рышард Зьбігнеў Карчмарскі, фатаграфія (Польшча); Енц Олаф Ластхейн, фатаграфія (Швэцыя); Лукаш Левандоўскі, графіка (Польшча); Томас Маер, фатаграфія (Польшча); Ені Ульрыка Ольсэн, графіка (Швэцыя); Марцін Росваг, фатаграфія (Нямеччына); Кястуціс Стошкус, фатаграфія (Літва).

### Гравюры Ота Дыкса

**Да 16 сьнежня ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасьці, 47)** працуе выстава «Ота Дыкс. Крытычная графіка 1920—1924». У сваіх гравюрах мастак рэалістычна паказвае паваенные грамадзтва: вэтэранаў і інвалідаў, маргіналаў пасьляваеннага часу. Сваімі працамі мастак не спрабаваў зьмяніць людзей — ён проста імкнуўся паказаць рэчаіснасьць.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**15 (сб), 16 (ндз)** — «Слуга двух гаспадароў».
**17 (пн)** — «Чычыкаў».
**18 (аўт)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**23 (ндз)** — «Таполевая завея».
*ранішія спэктаклі*
**23 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
*малая сцэна*
**23 (ндз)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

### Тэатар беларускай драматургіі

**14 (пт)** — «Сталіца Эраўнд».
**15 (сб), 21 (пт)** — «Адэль».
**16 (ндз)** — «Чорны квадрат».
**18 (аўт)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**19 (ср)** — «Нязваны госьць».
**20 (чц)** — «Шлях у Царград».
**22 (сб)** — «Сёстры Псыхеі».
**23 (ндз)** — «Містэр Розыгрышу».

### Тэатар юнага гледача

**21 (пт), 22 (сб), 23 (сб), 24 (пн), 25 (аўт), 26 (ср), 27 (чц), 28 (пт), 29 (сб), 30 (ндз)** — «Шчаўкунок».



# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК У ГОРАДНІ

**У Горадні** бацькі дванаццаці дзетак аб'ядналіся для адкрыцьця беларускамоўных групаў у дзіцячых садках. Наша група — гэта беларуская мова і культура выхаваньня, прыязная атмасфэра, шчырасьць выхавацелек і магчымасьць разьвіцьця здольнасьцяў дзіцяці. Нас ужо дванаццаць. Далучайцеся да нас. Мае сыны ўжо там! Для таго, каб далучыцца альбо даведацца болей, тэлефануйце Кузьмінічу Ігару праз тэлефоны: Velcom: 629-92-13, МТС: (029) 868-98-82

ці лістуйце: ikuzminich@yahoo.com

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Марыну і Сашу Чубрыкаў** з нараджэньнем дачкі. Хай расьце здаровенькая!

**Тусік!** З Днём народзінаў цябе, сонейка! Заўжды ўсьміхайся. Мусік, Лё і ўсе-ўсе-ўсе

### КНІГІ

**Новыя дыскі ад БМА**: Данчык «Беларусачка», Данчык/Барткевіч «Мы адной табе належым», Данчык «Равесьнікі», Андрэй Мельнікаў «Гэта Мы!», Эдуард Акулін

«Мая Крывія і іншыя песьні. 2 альбомы на 1 CD», Віктар Шалкевіч «Балады і рамансы», Віктар Шалкевіч «Смутны беларускі блюз» і інш. Т.:(029)649-08-88, (029)766-24-25, w1979@tut.by. Пытайцеся ў музычных крамах і незалежных распаўсюднікаў

**Прапаную кнігі**: Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларуск) слоўнік» 1924, М.Раманюк «Беларускае народнае адзеньне», «Беларускі кнігазбор»: Каліноўскі, Баршчэўскі, Чачот, Жылка, Дамейка, Гётэ, «Летапісы і хронікі», Пяткевіч, «Філаматы і філарэты» ды іншае, багаты выбар. Т.: (029)753-70-05

**Набор**, **рэдагаванне**, інтэрвію, аналітыка, падбор, апрацоўка інфармацыі матэрыялу, падрыхтоўка рукапісу да друку, пераклад, выдавецкія праекты, распаўсюд. Т.: (029)753-91-96. alesknigi@mail.ru

### БЕЛАРУСКАСЬПЕЎНАЯ СКРЫПКА

Прымем у падарунак, возьмем у часовае карыстаньне або нядорага набудзем (або памяняем на коціка!) смык для скрыпкі беларускай. Т.: (029)912-27-30

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 21—24 сьнежня па маршруце: Перамышль-Яраслаў-Сандомір (Польшча). Т.: (017) 292-54-58; (029)622-57-20; (029)509-12-16; (029)110-19-28

### ФАРСІ

**Урокі фарсі** і пэрсідзкага танцу. Зімой вучымся, летам едзем у Іран. Т.: (029)798-03-42



# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## КАЛІ Б...

**Сярод супрацоўнікаў КДБ былі дальтонікі.**



МАЛЮНАК ЛЁЛІКА УШКІНА

**Чэкіст:** Якая небясьпека дарожнага руху? Які флікерс? Саўсем абарзелі апазыцынэры? З паліцэйскімі павязкамі адкрыта па вуліцах ходзяць.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Мінск**. Вечарам 25 наябра паліцыя арыштавала сходку вучанікоў камэрчаскага вучылішча. Затрымалі 21 чалавека.

**У Мінску** казьнілі рабочага Левіна за тое, што ён нападаў на паліцыю ў г. Пінску.

**У Віцебскай губ.** закрыты прафэсіянальныя саюзы: у Нэўлі шчаціньнікаў, а ў Дзьвінску ... будаўляных работнікаў.

**«НН» №35, 1907**

**Прэзэнтацыя кнігі Астрыд Ліндгрэн «Малы і Карлсан-з-даху»**

Карлсан запрашае на Дзень народзінаў!

Уваходныя ледзяшы, цікавосткі, гульні, сьпевы й забаўкі чакаюць вас **19 сьнежня а 18 гадзіне ў Менскай абласной бібліятэцы імя А. Пушкіна (вул. Гікалы 4)**.

Падрыхтуй сваё віншаваньне Карлсану і не забудзься на фотаапарат, каб займець здымак зь любімым героем.

Супольнасьць «Нашыя дзеткі» (www.dzietki.org) зьвяртаецца да Вас з просьбай **дапамагчы ў арганізацыі штогадовай Беларускай Ялінкі**.

Летась Новы год з намі сустракалі больш за 60 дзетак. Сёлета зьявіліся новыя маленькія беларусікі. Кожны зь іх марыць пра цуд і сваё сьвята, кожнаму патрэбныя ўвага й падарунак. Спадзяемся, што супольнымі намаганьнямі мы зможам стварыць казку для сваіх дзетак. Будзем удзячныя за любыя парады й прапановы (памяшканьне, сцэнар, акторы, падарункі, пачастункі, давоз удзельнікаў і інш.). Расьцем беларусамі! Кантакты: e-mail: n.dzietki@yahoo.pl, тэлефон у Менску 292 31 85 (Вольга), (029) 632 27 43 (Крысьціна), (029) 403 15 35 (Натальля), ICQ 353 181 833, Skype: Mazurava

Пасьля цяжкай працяглай хваробы памёр выдавец, рэдактар, паэт, сцэнарыст **Раман Фрыдман**. Ён быў заснавальнікам некалькіх выдавецтваў, ініцыятарам шматлікіх кнігавыданьняў. Фрыдман зрабіў неацэнны ўнёсак у разьвіцьцё беларускага незалежнага друку, навуковай і мастацкай літаратуры.

Спачуваньні родным і блізкім выказвае калектыў выдавецтва «Энцыклапэдыкс», сябры.


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.



Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.12.2007.

Замова № 6809.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.